ПАГОНЯ

РЭГІЯНАЛЬНЫ АГЛЯД: ГОРАДНЯ — ВІЛЬНЯ — БЕЛАСТОК

ЗАСНАВАНА Ў 1920 г.

№ 14 (28) | 28 траўня — 3 чэрвеня 1993 г. | Кошт 5 рублёў

ВЭТЭРАНЫ-ПАЛІТЫКАНЫ. Адны ваявалі, другія апавядаюць.

Гарадзенскія гады вынаходніка **ЭСПЭРАНТА Л. ЗАМЭНГОФА.**

КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЭЙ або Дзе наша культурная сталіца?

Абраз **ЖЫРОВІЦКАЙ БОЖАЙ МАЦІ.** Рэпартаж з фэста.

Пагром у рэдакцыі «Лідзкай газэты»

Калі гэтым панядзелкам супрацоўнікі «Лідзкай газэты» прыйшлі ў сваю рэдакцыю, дык удачылі вынікі пагрому. Дзьверы чатырох габінэтаў былі выламаны, парвана й раскідана чытацкая пошта, рэдакцыйная кніга загадаў. Скрадзены быў толькі тэлефонны апарат.

Газэта пасьлядоўна прапагандуе беларускае адраджэньне, журналісты імкнуцца чым паўней асьвятляць гісторыю Лідчыны, за апошнія месяцы надрукавалі некалькі артыкулаў пра дзеі Арміі Краёвай... Гэта ўжо чацьвёрты пагром у рэдакцыі за апошні час. Вядзецца сьледзтва.

М. МІХАСЁЎ.

Небясьпечны цэзій

Дзякуючы сумесным дзеяньням супрацоўнікаў кафэдры дзіцячых хвароб Гарадзенскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута і прафкаму Бярозаўскага шклозавода, праведзены лябараторныя досьледы з нагоды анамальных зьяў у арганізме дзяцей вёскі Астроўна Лідзкага раёна.

Кіраўнічка досьледаў прафэсар Л. В. Евец паведаміла кар. «Пагоні»: «Мы выявілі, што ўтрыманьне цэзія ў мачы дзетак у 100 разоў перавышае усе дапушчальныя нормы, а гэта выклікае ў маладым арганізме малакроўе, аблысеньне, зьмены імунітэту.

Г. У.



Рыбная лоўля ў каламутнай вадзе. Мал. **С ХАРЭЎСКАГА.**

Гутарка пад акампанемэнт катэдральнага звона

Днямі мелі мы ў сябе ў Вільні цікавых гасьцей — хлапцоў і дзяўчат з Менску. Мы сустрэлі іх на панадворку дамкоў Таварыства Беларускай Культуры. Завязалася гаворка пра беларускія касьцельныя справы. Выдатным акампанемэнтам яе быў звон гадзіньніка на катэдральнай вежы.

У Менску вось ужо трэці год існуе беларуская парафія пры касьцёле Сьв. Тройцы, і нашыя госьці — якраз вернікі з гэтае парафіі. У Вільні ж сёньня беларускага касьцёла няма...

Гаворку распачала віленчанка спадарыня Людвіка Кардзіс.

— Калісьці ж і ў Вільні ўсё было! І сьвядомыя сьвятары, і сэмінарысты, і вернікі; перад вайной у касьцёле Сьв. Міхала былі беларускія набажэнствы; выдаваліся рэлігійныя газэты часопісы, кнігі... У 1989-м годзе мы паспрабавалі былі адрадзіць беларускі касьцёл тут, у Вільні. Арганізавалі касьцельную дваццатку, пісалі, хадзілі на прыёмы да ўладаў, духоўных і сьвецкіх. Аднак далей за добрыя намеры справа не зайшла. Рашучых захадаў з нашага боку не было, як не было й рэальнай падтрымкі з боку тых, да каго мы зьвярталіся. Ад тае задумы ў мяне засталася толькі тэчка з дакумэнтамі, цяпер ужо архіўнымі...

У нашых гасьцей настрой зусім іншы. Гавора Марыя Скуратовіч, завадатарка ў менчукоў:

— Мы якраз і прыехалі, каб дапамагчы вам. Маем даручэньне ад нашае Каталіцкае Грамады сустрэцца з тутэйшымі беларусамі, з тутэйшымі сьвятарамі. Галоўнае пачаць — каб далі свой касьцёл, далі добрага сьвятара,— а людзі пакрысе зьбяруцца. Мы пачыналі гэтак сама.

Дай Бог чутае бачыць, каб шчырыя парыванні менчукоў перадаліся віленскім беларусам.

— Мая мама была адной з першых, хто змагаўся за менскі Кальварыйскі касьцёл,— гавора Марыя Скуратовіч,— а мне ўжо даводзіцца ваяваць за наш касьцёл на Заталой Горцы. Тады ў Менску не было ніводнага дзейнага касьцёла. Людзі з 1972-га году пачалі настойліва дамагацца храма і ў 80-м улады вымушаныя былі перадаць касьцёл на Кальварыі.

Тры гады таму Беларуская Каталіцкая Грамада пачала арганізоўваць беларускую парафію ў касьцёле Сьв. Тройцы. Парафія ўжо даўно створана, а сам касьцёл дагэтуль не перададзены. Мы, абураныя тым, што ўлады цалкам ігнаравалі нашыя просьбы, пайшлі на адчайны крок — пасьля Велікоднага набажэнства засталіся ў касьцёле й дзяжурылі там дзень і ноч. Цяпер, праз тры тыдні, мы дамовіліся на кампраміс — у нашым касьцёле зноў праводзяцца канцэрты, але нам паабяцана, што касьцёл усё ж будзе перададзены цалкам.

— Як гэтая «вайна» адбілася на вашай парафіі? — пытаюся я.

— Ого, ўсе яшчэ болей зьядналіся! Гэтыя тры тыдні маліліся дзень і ноч — там ужо ўся прастора намоленая, добра перазнаёміліся адзін з адным, нашыя бабулі да нас, маладзейшых, сталі з большым даверам ставіцца.

— А што, дагэтуль былі праблемы з пакаленьнямі?

— Натуральна,— розныя пакаленьні — рознае выхаваньне, густы. Мы, напрыклад, сьпяваем хрысьціянскія песьні пад гітару. А нашым бабулям яны здаюцца завясёлымі, загучнымі, ледзьве ня скочнымі. Вядома, гэтыя песьні не для храма, але нам з гэтымі песьнямі цікава, асабліва, калі выпраўляемся кудысь у вандроўку-пілігрымку.

Гадзіньнік на вежы адбіў ужо пару гадзін... Мы гаварылі пра новыя сустрэчы, сумесныя вандроўкі, напрыклад, у верасьні, калі ў Летуву прыедзе Ян Павал II. Хто ведае, можа, з дапамогаю нашых сяброў зварухнецца справа з беларускім касьцёлам і ў Вільні.

Сяржук ВІТУШКА.

Днямі адбылася нечарговая канфэрэнцыя гарадзенскай рады БНФ. На трэці зьезд Беларускага народнага фронта, які мае адбыцца 29—30 траўня ў Менску, абрана 18 дэлегатаў з 20.

Дарэчы, на канфэрэнцыі была абмеркавана дзейнасьць грамадзка-палітычнага аб'яднаньня імя К. Каліноўскага. Прысутныя пагадзіліся, што «каліноўцы» ўзьніклі на глебе значнага паніжэньня актыўнасьці сяброў БНФ.

Г. У.

Правадыр — інвалід

Амаль цэлы год у цэнтры пасёлка Астрына на Шчучыншчыне панура стаіць бязрукі Ільіч. Многа дзесяцігодзьяў яго «правадырская» рука паказвала кірунак да сьветлай будучыні. Але сёньня ці то пажартаваў хтосьці, ці мясцовыя хуліганы «павесяліліся», але правадыр застаўся інвалідам.

Як адрэагавалі на гэта мясцовыя улады? Аніяк! Зьняць помнік, які стаў пасьмешышчам, баяцца. Прыляпіць новую руку таксама цяжка — няма сродкаў.

Кажуць, днямі старшыня аднаго мясцовага калгаса даў згоду быць фундатарам аднаўленьня рукі Ільіча.

А. ЗАСКАМКА.

Дзеля самаабароны

Некаторыя гарадзенскія памежнікі пачалі набываць газавыя пісталеты. Справа ў тым, што згодна існуючаму яшчэ савецкаму закону, памежнікам не выдаецца зброя. У час догляду й кантролю пасажырскіх цягнікоў, якія ідуць у замежжа, бяззбройныя памежнікі нярэдка сутыкаюцца з шантажом, нават пагрозамі. Каб адчуваць сябе больш упэўнена ў такім становішчы, некаторыя афіцэры памежнай службы набываюць на сваю рызыку вось такую ўласную зброю.

(га).

ГРАМАДЗТВА

Віленскія паведамленьні

ДЗЯРЖАЎНАЯ МОВА. Рэктар Віленскага ўнівэрсітэту Р. Павілёніс на паседжаньні сэната унівэрсітэту прапанаваў з кожнага ўдзільніка паседжаньня, які дапусьціў памылку ва ўжываньні летувіскае мовы, браць штраф — 1 талён за адну памылку.

БЕСПРАЦОЎЕ. На 1 траўня ў Летуве 100 тысяч працаздольных людзей ня мелі працы. З іх 30 тысяч зарэгістраваліся як беспрацоўныя. Узровень беспрацоўя на раёне ўдвая вышэйшы, чым у горадзе. У горадзе гэты паказчык найвышэйшы ў Аліце (Алітус), Панявежы й Вільні. Менш за ўсё беспрацоўных у Коўне. 23 працэнты беспрацоўных — былыя работнікі прамысловых прадпрыемстваў, 17 працэнтаў — працаўнікі сельскай гаспадаркі, 11 — будаўніцтва, 10 — гандлю й грамадзкага харчаваньня.

СЬМЕРЦЬ. Штодня ў Летуве гэты сьвет пакідаюць 114 чалавек. Для трохмільённай краіны гэта зашмат. Статыстыка сьведчыць, што сёлета ўпершыню за пасьляваенны час сьмяротнасьць у Летуве перавысіла нараджальнасьць. Атрымліваецца, што за год вымірае адзін з 44-х раёнаў краіны.

ГРОШЫ. Банк Летувы выпусьціў у абарачэньне новую купюру вартасьцю 500 талёнаў. Гэта насуперак рэкамэндацыям Міжнароднага валютнага фонду спыніць эмісію перад увядзеньнем нацыянальнае валюты — літа. Праўда, другую рэкамэндацыю МВФ урад Летувы вытрымлівае, адмовіўшы настаўнікам у падвышэньні заробку да 10 пражыцьцёвых мінімумаў. У выніку настаўнікі пачынаюць страйк, і ў дзяцей сёлета ў чэрвені ёсьць шанц не здаваць школьныя іспыты. Між тым, абменныя пункты ў Вільні амаль спынілі скупку цьвёрдай валюты, што тлумачыць недахопам талёнаў, бо атрымалі распараджэньне мець гатоўкаю па 600 мільёнаў. Цяпер у «эксчэйнджах» стаяць велізарныя чэргі, а канвэртаваная валюта толькі за два дні 14-15 траўня патаньнела на 20%. Гэтак, даляр ЗША 13-га скуплялі па 540, а 15-га ўжо па 450. Штучны рост талёна аніяк не адбіўся на цэнах, якія працягваюць расьці.

Паводле матэрыялаў СМІ падрыхтаваў А. К.

Сьвята песьні

Па-сапраўднаму сьвяточна праходзіў у мінулую нядзелю ў памяшканьні Дома афіцэраў Гарадні Другі фэстываль польскай песьні. У ім брала ўдзел каля пяцісот чалавек практычна з усіх раёнаў Гарадзеншчыны, а таксама з Менску й Берасьця.

Адкрыцьцё сьвята распачалося набажэнствам ў Кафэдральным саборы. Госьці фэстывалю з розных гарадоў і вёсак Беларусі бралі ўдзел яшчэ і ў канцэртах, арганізаваных на сцэне Старога парку. Адметнасьць гэтага фэстывалю ў тым, што, акрамя дарослых, у ім бралі ўдзел і дзеці.

Аддзел культуры Гарадзенскага гарвыканкама зацьвердзіў для ўдзельнікаў спэцыяльныя прызы. А ладзіў гэта сьвята Саюз палякаў на Беларусі з дапамогай Міністэрства Культуры РБ.

(ав).

Жыве яшчэ піянерыя!

Вельмі зьдзівіліся травеньскай раніцай шчучынцы таму, як па вуліцах райцэнтра маршыраваў у белых кашульках пад чырвонымі гальштукамі атрад піянераў. Дзеці перапытвалі дарослых, а хто гэта такія? Толькі ўвечары даведаліся, што па горадзе вандравалі школьнікі адной з вясковых школаў раёна, якія пажадалі на яве спазнаць гарадзкое жыцьцё.

А. ЗАСКАМКА,
г. Шчучын.

Першы Дом палякаў

22 траўня, у суботу, у Горадні на вуліцы Дзяржынскага адбылося ўрачыстае адкрыцьцё Дома палякаў, у якім памясьціўся часовы цэнтар Польскай культуры. Дом гэты быў збудаваны меней, чым за год. Цырымонія пачалася з таго, што ўсе, хто сабраўся ў гэты момант каля новага будынку, засьпявалі гімн Палёніі.

Як зазначыў у сваім выступленьні старшыня Саюза палякаў на Беларусі Т. Гавін: «Гэты дзень стане гістарычным для нашых абедзьвюх краін». Ён таксама дадаў, што раней за бальшавікамі марыць аб такой урачыстай падзеі ня мог ніводзін паляк на Беларусі. А таксама зазначыў, што цяпер чарга за адкрыцьцём польскіх школак.

Дзеля гэтай падзеі Горадню спэцыяльна наведаў старшыня сусьветнай Палёніі А. Стэльмахоўскі, які вельмі ўсхвалявана віншаваў тутэйшых палякаў і зазначыў, што чалавек, які ня мае свайго дому, адчувае сябе ня вельмі ўтульна, дзе б ён ня жыў. А. Стэльмахоўскі выказаў надзею, што польская меншасьць на Беларусі будзе мець усе магчымасьці, каб і надалей адраджаць і разьвіваць сваю культуру.

Ад мясцовых уладаў віншаваньні выказаў намесьнік старшыні Гарадзенскага гарвыканкама А. Мілінкевіч. Ён таксама выказаў надзею, што ў нашым горадзе хопіць месца ўсім культурам, якія здаўна тут прыжыліся й заўсёды мірна суіснавалі. Урэшце ўсім палякам спадар Мілінкевіч пажадаў традыцыйных «сто лят».

На адкрыцьці Дома палякаў таксама прысутнічалі консул Польшчы ў Менску К. Длужэўскі й сэнатар польскага Сойму Ю. Галаса, якія шчыра й нешматслоўна павіншавалі гаспадароў цудоўнага Дома.

Была зачытана віншавальная тэлеграма, дасланая Міністэрствам культуры Беларусі на адрас Саюза палякаў з нагоды гэтага сьвята.

Бела-чырвоную стужку перарэзаў ганаровы госьць А. Стэльмахоўскі. Згодна з каталіцкай традыцыяй цырымонію скончыў сьвятар, які прачытаў малітву й асьвяціў дом.

Пасьля ўрачыстае часткі на падворку каля дома адбыўся невялікі канцэрт.

М. МІКАЛАЙЧЫК.

Вэтэраны, вэтэраны, ці беларускія сыны?

Абмовімся адразу: гаворка пойдзе не пра вэтэранаў навогул, а тычыцца тых, якія сёньня, на маю думку, стаяць на пазыцыях непрыняцьця беларускага, актыўна з гэтым, беларускім, змагаюцца — і словам, і дзеяньнямі.

У свой час, працуючы ў рэдакцыях раённых газэт Меншчыны й Гарадзеншчыны, мне даводзілася многа пісаць пра людзей сталага веку. Сумленныя працаўнікі, сьціплыя й нешматслоўныя, яны неахвотна распавядалі пра сябе, свой удзел у Вялікай Айчыннай. Напрацаванымі рукамі бралі пудэлак з узнагародамі, сярод якіх асноўнымі былі медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі», й проста, па-салдацку шчыра й па-сялянску адкрыта, гаварылі пра баі, раненьні, сяброў, сьмерць...

Магчыма, тыя вэтэраны яшчэ й цяпер жывуць у вёсках дый маленькіх райцэнтрах. Яны аднойчы на год — 9 мая — у сьвяточных гарнітурах прыходзяць да магілы ахвяр вайны, каб аддаць даніну павагі сваім роўналеткам, палеглым даўно, амаль 50 гадоў назад.

Вэтэранаў гэтай катэгорыі мала запрашаюць на вечарыны, яны аднекваюцца, маўляў, які я герой, прасядзеў у акопах, аўтаматчыкам быў (артылерыстам, мінёрам, у разведузводзе...). Ды й разпавядальнікі з іх ня лепшыя. Хіба дзеці зразумеюць нешта, слухаючы такога дзядка, пра вайну, кроў і слёзы? Мала падыходзяць вясковыя вэтэраны для вядзеньня ваенна-патрыятычнага выхаваньня. І ваявала асноўная маса толькі з лета 1944. Ці не таму ў нашым грамадзтве даўно зьявіліся штатныя выступанцы з асяродку вэтэрнаў. Ім нічога не каштуе чыркнуць артыкул пра вайну ў газэту, выступіць па радыё, перад любой аўдыторыяй.

Вы таксама не раз слухалі гэтых прапагандыстаў. І я слухаў. І параўноўваў з тымі вэтэранамі, вясковымі, адкрытымі сэрцам і душой. Вось што цікава: нешта ня бачна сярод актывістаў вэтэранскага руху простых ваяроў, усе палкоўнікі й падпалкоўнікі, дзе-нідзе маёр-капітан сустрэнецца. Аднак гавораць толькі ад імя ўсіх вэтэранаў, нібыта запыталіся ў іх дазволу. Успаміны льюцца гладка, як па пісанаму, гучаць словы накшталт «наша армія», «наша дывізія», «камандуючы фронтам даў загад...», «мы фарсіравалі Нёман», «загінула нямала нашых таварышаў» і г. д. Відавочна, што такі палкоўнік-падпалкоўнік мае час для чытаньня мэмуарнай літаратуры. Міжволі думаецца: ну а твой удзел у вайне чым вымяраецца? Табе што, сам гэнэрал даваў загад ці са штабнога бліндажу ўвесь фронт быў як на далоні?..

Яшчэ адно назіраньне. Ёсьць вэтэраны тутэйшыя й ёсьць вэтэраны, якія цягам лёсу засталіся на заходніх землях Беларусі пасьля вайны. Альбо партызанілі тут у складзе дывэрсійных груп, атрадаў. Многія потым занялі кіруючыя пасады ў райкамах, выканкамах. Мясцовым, відаць, веры не было — былі пад акупацыяй...

Так што вэтэран вэтэрану не роўня. Адныя дбаюць пра хлеб наяўны, другія плануюць, як надалей захаваць у памяці народнай веліч перамогі над фашызмам. І тут нічога не скажаш — патрэбная справа. Але бярэ роздум, асабліва пасьля нядаўняга аб'яднанага пленума вабласной арганізацыі аховы помнікаў культуры й вабласной вэтэранскай арганізацыі. Па-першае, чаго тут было больш — палітыкі ці ўсё ж абмеркаваньня пытаньня парадку дня?

У асноўным дакладзе прыводзілася безьліч лічбаў: колькі на Гарадзеншчыне помнікаў, пастаўленых на месцах былых расстрэлаў савецкіх грамадзян фашыстамі, у памяць аднавяскоўцаў, што загінулі ў партызанах і на фронце, у якім стане сёньня гэтыя помнікі, гаварылася пра варварства ў адносінах да манумэнтаў, дзейнасьць першасных арганізацый на месцах...

Абмеркаваньне больш нагадвала справаздачы, дзе-нідзе густа замеяныя на палітыцы. Напрыклад, прафэсар У. Верхась чамусьці пачаў выкладаць погляды на сучасны момант з пункту гледжаньня сваёй партыі камуністаў Беларусі. У зале недаўменна пераглядваліся, перашэптваліся: навошта праводзіць партсходы?

Упершыню асабіста слухаў шаноўнага вэтэрана А. Цітова. Што й казаць — мастак, умее трымаць аўдыторыю. Пачаў з таго, што ўлады не глядзяць за тым, каб схапіць за руку падлеткаў, якія зьбіваюць прозьвішчы воінаў з мэмарыяльных помнікаў, а скончыў дэмагагічным патыньнемсьцьвярджэньнем: раней пра памяць загінуўшых клапаціліся партыйныя арганізацыі, то мо якраз бяда ў тым, што іх няма...

Народны дэпутат Беларусі М. Лакцюшын зусім выступаў не па тэме. Ён рашуча накінуўся на БНФ, Зянона Пазьняка й іх прыхільнікаў. Гаварыў пра эмэрыканскія даляры, грамадзкія арганізацыі, якія развалілі (!) Саюз. Увогуле, мог і не закранаць гэтых тэм, бо мы неаднаразова слухалі паважанага вэтэрана падчас ягоных выступленьняў на сэсіі Вярхоўнага Савета, яго заклікі да ваеннага саюза з Расеяй, інтэграцыю эканомікі рэспублікі ў эканоміку вялікага ўсходняга суседа. Але прычым тут помнікі?

ЭСПЭРАНТА

Гарадзенскі акуліст Лазар Замэнгоф

У архіўных дакумэнтах, знойдзеных у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Беларусі ў г. Горадні, значыцца імя лекара-акуліста Лазара Маркавіча Замэнгофа, які жыў у доме Разманінай на Паліцэйскай вуліцы, (цяперашняя — Кірава). Захавалася асабістая распіска Л. Замэнгофа з наступным зьместам: «Я, ніжэй падпісаны, ў складзе чыноўнікаў ваенна-медыцынскага ведамства, ў выпадку вайны жадаю выконваць ваенна-медыцынскія абавязкі па месцы майго жыхарства, ў г. Горадні.

Л. Замэнгоф».

Лазар Маркавіч Замэнгоф нарадзіўся ў г. Беластоку Гарадзенскай губэрні ў інтэлігэнтнай габрэйскай сям'і. Дзед і бацька працавалі выкладчыкамі замежных моў. У тагачасным Беластоку насельніцтва (30 тыс.) складалася з 5-ці асноўных этнічных груп: палякаў, рускіх, габрэяў, немцаў, беларусаў. У дзяцінстве Лазар здолеў вывучыць усе мясцовыя мовы, дасканала валодаў рускай, пісаў на ёй вершы. Сьведка многіх нацыянальных канфліктаў, Л. Замэнгоф марыў аб нэйтральнай мове, агульнай для ўсіх людзей — як сродку, які ўсталюе мір і павагу паміж народамі: «Я з дзяцінства пачаў марыць аб тым шчасьлівым часе, калі ўзнікнуць мова й краіна, якія будуць з поўным правам належаць ўсім сваім грамадзянам, калі людзі зразумеюць і пакахаюць адзін аднаго».

З гэтай ідэяй Замэнгоф пачаў працаваць над стварэньнем нэйтральнай мовы. Вучнем 8-ай клясы філалягічнай гімназіі ён ужо стварае першы праэкт новай мовы. Але бацька дамагаецца, каб ён паступіў на мэдыцынскі факультэт Маскоўскага унівэрсітэта... Калі сын вучыўся у Маскве, Марк Замэнгоф, які лічыў задумку Лазара дарэмнай справай, спаліў рукапісы сына...

У бацькоў не хапала сродкаў вучыць сына ў Маскве, і Лазар вяртаецца да Варшавы, дзе працягвае адукацыю ў Варшаўскім унівэрсітэце. Атрымаўшы дыплём лекара, ён практыкуе ў клініках Вены, а затым вяртаецца ў Варшаву. Днямі ён лечыць хворых, а вечары прысьвячае сваім двум ідэялам — міжнароднай мове й безнацыянальнай рэлігіі. У Варшаве Лазар Замэнгоф распрацоўвае другі праэкт мовы. Але на працягу двух год ён ня можа знайсьці выдавецтва, якое згадзілася б надрукаваць працу лекара асобнай кнігай.

Толькі ў 1887 годзе выходзяць у сьвет першыя падручнікі Эспэранта на рускай, польскай, нямецкай і французкай мовах. Першую кнігу Замэнгоф падпісаў псэўданімам — «Доктар Эспэранта» — доктар, які спадзяецца. Пазьней слова «эспэранта» стала агульнай назвай новай мовы, якая атрымала падтрымку вучоных-лінгвістаў, дзяржаўных дзеячоў розных краін сьвету.

■

У пошуках заробку сям'я Замэнгофа часта пераязджала з месца на месца. У кастрычніку 1893 года Л. Замэнгоф перасяляецца ў Горадню. Тут на працягу 4-х год ён працуе доктарам-акулістам. З поўнага збора твораў Л. Замэнгофа мы можам даведацца аб тым, што, жывучы ў Горадні, ён займаўся рэформай Эспэранта, рыхтаваў матэрыялы для кніжнай сэрыі «Бібліятэка», рэдагаваў часопіс «Эспэрантыст». У № 12 за 1894 год у ім ёсьць цікавая абвестка: «З наступнага нумару (студзень 1895) наш часопіс поўнасьцю будзе рыхтаваць Замэнгоф, які цяпер ня толькі рэдактар, але й яго адміністратар. Аб гэтым мы й інфармуем нашых паважаных чытачоў і просім афармляць падпіску ў самаго Замэнгофа ў г. Горадні».

Большую частку творчай энэргіі Л. Замэнгоф аддаў стварэнню міжнароднай мовы, падручнікаў і слоўнікаў. Але гэтым ня вычэрпваецца яго талент. Ён таксама складаў вершы на мове Эспэранта. Многія радкі яго вершаў сталі крылатымі выразамі для эспэрантыстаў. Ягоны верш «Эспэра» («Надзея»), пакладзены на музыку французкім эспэрантыстам Фільенам Мэньо дэ Мэні, стаў міжнародным гімнам і гучыць на міжнародных кангрэсах і сустрэчах эспэрантыстаў. Радкі гімна «Народы ў згодзе ўтвораць адно вялікае сямейнае кола» высечаны на гранітнай мэмарыяльнай шыльдзе на доме № 5 па вуліцы Кірава ў Горадні.

Л. Замэнгоф пераклаў на мову Эспэранта многія клясічныя творы, шэдэўры мастацкага слова, такія, як «Гамлет» Шэкспіра, «Лотры» Шылера, «Рэвізор» Гогаля, «Казкі Андэрсэна» ў 4-х тамах, «Біблію».

Сьветапогляд Л. Замэнгофа, яго жыцьцёвая пазіцыя й філязофія адлюстраваны ў зборы пісьмаў і прамоў на міжнародных кангрэсах. Поўны збор твораў Л. Замэнгофа ў 12-ці тамах выдадзены ажно ў Японіі ў 1973 годзе.

■

Сусьветная грамадзкасьць даўно прызнала вялікае значэньне мовы Эспэранта ў міжнародных зносінах. Імя Л. Замэнгофа вядома ва ўсім сьвеце, а яго лінгвістычны твор — мова Эспэранта — вось ўжо больш за 100 гадоў жыве на зямлі. Філёзаф-гуманіст Л. Замэнгоф спадзяваўся, што Эспэранта стане сродкам аб'яднаньня ўсіх зямлян, паслужыць разьвіцьцю братэрскіх узаемаадносін паміж людзьмі, незалежна ад нацыянальнасьці, веравызнаньня й сацыяльнага паходжаньня. І сапраўды, мова Эспэранта стала мовай міжнародных зносін, асабліва ў апошнія дзесяцігоддзі, калі ўсё больш і больш пашыраюцца эканамічныя й культурныя сувязі паміж рознымі краінамі сьвету. Эспэранта стала адной з рабочых моў на міжнародных кангрэсах, на ёй чытаюцца даклады й абараняюцца навуковыя дысертацыі.

На Эспэранта выдаецца звыш 200 найменняў газэт і часопісаў, найбольш вядомыя — «Чалавек і космас», «Міжнародны агляд», «Навуковы агляд». 45 радыёстанцый сьвету працуюць на мове Эспэранта. Дзесяткі мільёнаў людзей размаўляюць і вядуць перапіску на Эспэранта, яна вывучаецца ў школах і вышэйшых установах розных краін сьвету.

Існуе Міжнародная Асацыяцыя эспэрантыстаў з цэнтрам у Ротэрдаме (Нідэрланды), існуюць дзесяткі арганізацый Эспэранта, ў тым ліку прафэсійных — ліг, аб'яднаньняў, асацыяцый. Дыплёмы й атэстаты Міжнароднай акадэміі Навук ў Сан-Марыне, рабочай мовай якой зьяўляецца Эспэранта, высока ацэньваюцца ў дзяржавах Эўропы й Амэрыкі. Аўтарытэтнымі прыхільнікамі Эспэранта звяўляюцца ААН (UNESKO) і Сусьветны Савет Міру.

■

«Эспэра» — «Надзея» — так называецца Гарадзенскі Эспэранта-клуб, які з 1983 года дзейнічае пры гарадзкім Доме культуры па вул. Дзяржынскага, 1. Тут беражна захоўваюцца копіі з архіўных дакумэнтаў, у якіх

(Працяг на 4-й стар.).

ЧАЭС імя Леніна

«Барысаўская макаронная фабрыка імя У. І. Леніна», напэўна, й сёньня гэтак жа завецца. Недарэчна-сьмешная назва. Чарнобыльская атамная электрастанцыя таксама была «імя У. І. Леніна». Злавесна-жыцьцёвая назва, якая без лішніх словаў адлюстроўвае сапраўдную, а не рэклямную сутнасьць савецкай улады. «А цяпер, ядрону маць, і Чарнобыль будуць знаць!»

Злачынства стагоддзя, а потым замоўчваньне, сакрэтнічаньне (вядома ж — у імя «дзяржаўных інтарэсаў»), хлусьня. Сьлюнькоў у партыйным сьвербе рапартуе Маскве: справімся самі. Мы, беларусы, кінутыя й нікому не патрэбныя, абылганыя, «уличенные» у радыёфобіі маскоўскім акадэмікам Ільіным з хеўрай, якія зрабілі на ахвярах капітал... Напаўпустыя прылаўкі ў крамах і малако, мяса з радыёнуклідамі. Чысьцейшае мяса — у Гомельскую вобласьць, атручанае — нам. Масква ўпарціцца й не жадае даваць грошы на чарнобыльскія справы. У падзяку Гомельская з Магілёўскай вобласьці рашуча галасуюць на рэфэрэндуме за Савецкі Саюз...

Украінцы прыдумалі «Хай жыве КПСС на Чарнобыльскай АЭС», мы паўтараем, а КПСС у Чарнобыль ня хоча, нават абураецца: тэорыя, маўляў, была прыгожая, марксізм-ленінізм, а таму варта яшчэ раз паўтарыць. Як, цікава, пры патрэбе зноў прагаласуе макаронная фабрыка імя Леніна — за «ЧАЭС імя Леніна» ці не?..

(бр).

Падумалася: цікавая справа! Тав. Лакцюшын, дэпутат Вярхоўнага Савета рэспублікі, і яго аднадумцы-вэтэраны, абраныя не народным галасаваньнем, а на пленумах і канфэрэнцыях, сёньня вядуць рэй супраць сувэрэнітэту Беларусі, яе дзяржаўнай мовы, незалежнасьці. Паразважайце над тэкстамі выступленьняў гэтых «выбраньнікаў», як правіла, старшынь гарадзкіх і раённых арганізацый вэтэранаў вайны й працы. Шмат аб чым гавораць вынікі паіменнага галасаваньня па тых ці іншых пытаньнях.

50-годдзе перамогі над фашысцкай Германіяй сапраўды вялікае сьвята. І дзіўна цяпер чуць пра пахаванні салдат Вялікай Айчыннай. Чые косьці ўсё яшчэ ляжаць на зямлі. Паўстагоддзя не хапіла, каб зрабіць гэта. Усё не ставала сродкаў. Аб вэтэранах заўсёды ўспаміналі толькі перад круглымі датамі. І ўзводзілі пампезныя мэмарыялы — халодныя й ўрачыстыя. Не шкадавалі мільёнаў грошай. А ў той жа час па вёсках бедавалі адзіноkія салдацкія ўдовы. Мне даводзілася ня раз пісаць пра гэтых жанчын, для якіх дроў прывесьці ці комін перакласьці ставалася вялікай праблемай.

Цяпер зьявілася задумка чарговага помніка — той удаве салдата, што загінуў на фронце. Зноў жывы чалавек і клопат пра яго падмяняецца каменнай скульптурай. Так прасьцей, чым штодня дбаць пра старога вэтэрана, вырашаць яго праблемы. Зноў будзе месца для правядзеньня ўрачыстасьцяў, дзе будуць гучаць высокія словы пра подзьвіг народа, падзяка воінам — жывым і мёртвым. Дык паклапоцімся пра жывых! Хопіць слоў! Далі Бог, адрамантаваная хата ўдзельніка вайны, стварэньне яму нармальных умоў жыцьця — куды больш значна, чым манумэнт, якіх досыць на нашай зямлі.

Раней мы часта чыталі: вэтэрану ёсьць да ўсяго справа. Такі журналісцкі штамп. Ад пільнага вока састарэлага актывіста нічога не ўсклізьне. Сігналізавалі пра ўсё: дрэнныя дарогі, аблічваюць у крамах, ходзяць у царкву, носяць шырокія (вузкія) штаны, не паважаюць старэйшых, жывуць не па сродках...

Сёньня частка вэтэранскіх дзеячоў, і найперш з дэпутацкімі значкамі, рашуча кінулася ў бойку за ўласныя прынцыпы. Што ж не падабаецца? А ўсё, што не супадае з іх меркаваньнямі. Гэрб, сьцяг, новыя назвы вуліц, дзейнасьць улад. Чыясьці нябачная рука зараз накіроўвае крыжовы паход супраць намесьніка старшыні гарвыканкама Аляксандра Мілінкевіча. У газэтах камуністычнага накірунку раптам зьявіліся допісы супраць яго. Прычым, па-бальшавіцку раз'юшаныя й бяздоказныя, дзе акрамя лаянкі й прымітыўнага мысленьня нічога добрага няма. Даўся ж у знакі Аляксандр Уладзіміравіч як сваімі артыкуламі ў прэсе, так і цьвёрдай пазіцыяй дэмакратычнага кіраўніка. І справа тут не ў назвах вуліц, нават не ў надуманай спробе працягнуць праз сэсію гарсавета пытаньне аб пераносе помніка правадыру пралетарыяту (гэтае пытаньне наогул не ставілася на парадак дня). Усё куды больш сур'ёзна. Па-сутнасьці, вядзецца дыскрэдытацыя праз асобу А. У. Мілінкевіча беларусізацыі ў Горадні, вяртаньня да сваёй гістарычнай памяці й спадчыны. Звыш- і проста інтэрнацыяналісты раптам занепакоіліся лёсам вуліц Суворава, Чапаева, Сацыялістычнай. Горкага, Астроўскага і іншых на сёньня замежных для нас ваенных, палітычных і культурных дзеячоў. Занепакоіліся зьменай звыклага ладу жыцьця, прыходам да ўлады маладых палітыкаў прагматычнага кірунку. Ці не таму вэтэраны з ліку адстаўнікоў Узброеных Сіл, былых намэнклятурных работнікаў так часта наведваюцца ў гарвыканкам, каб заявіць свой чарговы рашучы пратэст з нагоды й без яе. А галоўнае нагадаць пра сябе, пацешыць старэчае самалюбства — вось мы вам пакажам, ёсьць яшчэ порах, ведай нашых. А каб візыты былі больш пераканаўчымі, не пашкодзіць і чырвоны сцяжок вышэй галавы ўзняць, накрэмзаць на паперцы заклік накшталт «Беловежский сговор — путь к предательству!»...

Запомніліся словы аднаго з верхаводаў камуністаў горада Архіпава падчас першамайскага мітынгу. У адказ на не вельмі ўдалае выступленьне кіраўніка гарадзкой філіі Грамады шаноўны навуковец заклікаў сваіх прыхільнікаў і аднадумцаў прыслухоўвацца да думкі, якая не супадае з асабістай. Трэба навучыцца пераконваць не толькі сьвістам і крыкам, а аргумэнтамі, доказамі. Калі ж гэтага няма, то лепш памаўчаць. Гэта я дадаю ад сябе.

В. КАВАЛЁЎ.
г. Горадня.

● Пошта

Недарэчны ліст

Паважаная рэдакцыя! Я выпісаў на другое паўгоддзе газэту «Пагоня», а пакуль што купляю яе ў кіёску.

Трымаю ў руках два апошнія нумары, 11-ы й 12-ты, якія варта было б пахваліць, калі б не адзін вялікі «пракол»: артыкул «Вось табе й «воля», Беларусь...» у адзінаццатым нумары. Зрэшты, сам артыкул ня варты таго, каб пра яго зьмест выказваць нейкія меркаваньні. Гэта ліст не проста нацыяналіста, але чалавека, апантанага ненавісьцю да іншага народа. Да таго ж аўтар абражае ня толькі палякаў, але й беларусаў-каталікоў, называючы каталіцызм і вунію «сьмяротнымі ворагамі» беларускага народа. Зьдзіўляе, што рэдакцыя палічыла неабходным надрукаваць гэты ананімны (!) ліст, у якім хутчэй тэндэнцыйныя эмоцыі, чым пазіцыя, падмацаваная фактамі (цытую вашыя словы з уступу).

Што ж датычыць закліку выказаць свае думкі пра беларуска-польскія адносіны, то чытачы, безумоўна, адгукнуцца на яго. Магчыма, й я пазьней напішу на гэтую тэму. Шкада толькі, што дыскусія пачынаецца з вельмі недарэчнага ліста ананімнага аўтара.

Ф. ЛІТВІНОВІЧ,
г. Ашмяны.

КУЛЬТУРАЛЁГІЯ

Краязнаўчы музэй

«Я зноў пераконваюся, што спазнаньне сьвету пачынаецца са спазнаньня роднага краю... альбо сканчаецца ім»,— гэта словы з раману вядомага нямецкага пісьменьніка Зыгфрыда Ленца «Краязнаўчы музэй». Ягоны галоўны гэрой — Зыгмунд Рагала, мазур па нацыянальнасьці, пасьля дэпартацыі свайго народу ў Нямеччыну напрыканцы Другой Сусьветнай вайны стварыў там краязнаўчы музэй сваёй «фатэрлянд» — Мазурыі, якая адыйшла да Польшчы пасьля падзелу земляў Усходняе Прусіі. Захопленыя магчымасьцю далучыцца да «вышэйшае арыйскае нацыі», суайчыньнікі Зыгмунда Рагалы зьдзекуюцца з яго, маўляў, паглядзіце: кожны экспанат славянскага паходжаньня горшы ад твораў нямецкага народнага мастацтва. Але ўпарты руплівец знаходзіць аднадумцаў, з энтузіязмам над стварэньнем музэя працуе ўся яго сям´я.

Час ідзе, мацнеюць сілы рэваншызму, зьяўляецца патрэба ў ідэялягічным падмацаваньні. Узгадваюць пра музэй, дзе кожны экспанат нібыта сьведчыць пра сапраўды арыйскае паходжаньне жыхароў Мазурыі, пра тое, што яна зьяўляецца спрадвечна нямецкай зямлёю. І тады Зыгмунд Рагала спаліў свой музэй. У полымі загінулі неаднаўляльныя творы народнага мастацтва, кнігі, кілімы. Гэта страшная трагедыя для ўсёй сям´і. Ад яго адварочваюцца. Абгарэлы Рагала самотна ляжыць у шпіталі й павольна распавядае сваю сумную гісторыю маладому немцу — жаніху сваёй дачкі, які адзіны прыходзіць да старога з мэтай хоць неяк разабрацца ў тым, што здарылася...

Я прачытаў раман у 1985 годзе. І хаця разьмераная ціхая споведзь галоўнага героя выкладалася аж на пяцістах старонках тэксту, я тады так і не зразумеў яго ўчынку. Тады я й ня мог яго зразумець. А нядаўна ўзгадаў падзеі 1990-га году й жахнуўся, як шмат часу прайшло. Цэлая эпоха. І толькі нядаўна да нас пачаў даходзіць сэнс гэтай жорсткай алегорыі рамана Зыгфрыда Ленца.

Зараз мы, мабыць, палім свой «краязнаўчы музэй».

ЯШЧЭ пару гадоў таму не існавала беларускае палітыкі. Была толькі культура, часткова афіцыйная. А таму яна нагадвала айсбэрг, у якога невялічкая легальная частка бачылася над паверхняю вады. Пару гадоў таму штормам айсбэрг быў выкінуты на бераг выспы. Разгубленыя дзеячы культуры раптам зразумелі, што выспа тая — беларуская дзяржава, пра якую яны толькі марылі, а другія баяліся марыць. Зкрышталізаваны вакол асноўнае глабальнае традыцыі — «Пагоні», якая ледзь-ледзь праглядала праз тоўшчу замёрзлае вады, айсбэрг пачаў раставаць. «Пагоня» вызвалілася й стала гэрбам-здабытчыкам усяе выспы. Тут і пачаўся крызіс культуры.

Тая невялічкая легальная частка са зьдзіўленьнем убачыла, што ніхто нічога ў іх не забірае, а таму, не марудзячы, пачала далей займацца звыклымі справамі: надаваць сабе народныя званьні, друкаваць свае, нікім не чытаныя кніжкі, фільмаваць нікому не цікавае кіно.

Усе астатнія пачалі ліхаманкавыя пошукі страчанае традыцыі. Збольшага выхадцы з правінцыі, з вёскі, яны раней наракалі на гараджан (маўляў, вам усё на сподачку, а мы кроўю й потам), а цяпер вырашылі, што хопіць такіх стратаў і, прыняўшы тую былую легальную частку, хутка й паўсюдна ўбіліся ў існуючую дзесяцігоддзямі сістэму беларускай а-ля вясковае культуры.

Тыя, каму ўсё «на сподачку», адмовіліся ад афіцыёзу й афіцыйных структураў, сталі паўсюдна ствараць прынцыпова новае, сваё. Дыяпазон пошукаў бязьмежны. Хто стаў вуніятам, хто сацыял-дэмакратам, а хто й каталіком. Моладзь рашуча рушыла наперад, людзі сталага веку пастаянна азіраліся назад. Яны выявілі сапраўднае майстэрства доказу кампрамісу.

Прафэсар Конан, напрыклад, мадэрнізаваў асноўны пастулят Усевалада Ігнатоўскага пра сялянскасьць беларускай нацыі, якім, дарэчы, ня грэбаваў у свой час і Лаўрэньці Абэцэдарскі. Выступаючы на 1-ым Сусьветным зьезьдзе беларусістаў, ён, спаслаўшыся на тое, што апошнія сто гадоў асноўным спажыўцом беларускае культуры зьяўлялася вёска, якая ў апошнія гады амаль страціла сваю беларускасьць, прафэсар Конан зрабіў выснову, што дзеля адраджэньня нацыі неабходна наноў выхаваць беларускамоўнае сялянства. Памылковасьць такой высновы, на мой погляд, у тым, што за апошнія гады Беларусь ператварылася з аграрнае ў індустрыйную дзяржаву. Але, трэба адзначыць, гараджане, ня ўбіваючыся ў падрабязнасьці, успрынялі гэты пастулят досыць скэптычна.

Часам у нас пачынаюць блытаць культуру з рэлігіяй. Дагэтуль ня могуць супакоіцца прыхільнікі пераносу праха Максіма Багдановіча, натхнёныя прыкладам вяртаньня мошчаў Эўфрасіньні Полацкай з Кіева-Пячорскае Лаўры. Існуе нават мерваваньне, што пакуль косткі паэта ня будуць перазахаваны на Беларусі, у нас так і не пачнецца сапраўднае адраджэньне. Мараць пранесьці яго на руках аж ад самае Ялты. Гэткі крыжовы шлях са сьвятымі мошчамі на плячах...

НАЙБОЛЬШ насычанымі падзеі сталі пасьля таго, як невялікая частка інтэлектуальнае моладзі зьехала ў Вільню, абвясьціўшы



нашую гістарычную сталіцу галоўным месцам, дзе трэба шукаць страчаную традыцыю беларускае культуры. Менск яны абвясьцілі «мёртвым» горадам, максімальная пэрспэктыва якога — дарасьці ў культуры да ўзроўню індустрыйных парыжскіх ускраінаў. Пастулят гэты выводзіцца з таго, што немагчыма далей гаварыць пра чарговае адраджэньне нашае культуры, бо кожнае новае адраджэньне ў такім выпадку павінна пачынацца з нулявой адзнакі, вяртаючыся ў пачатак шляху пасьля кожнага заняпаду. Абвясьціўшы гэта абсурдам, хлопцы адправіліся ў Вільню шукаць падмурак, глебу для адраджэньня культуры. Цяжка спрачацца з такой пазіцыяй. Але калі шукаць пачатак культуры ў глабальным маштабе, тады трэба увогуле йсьці на паганскае капішча. Калі шукаць пачатак дзяржаўнасьці — трэба ехаць у Полацк. Калі шукаць пачатак каралеўска-эўрапэйскае традыцыі, тады трэба ехаць у Наваградак.

Але за аснову ўзята ўсё ж-такі Адраджэньне. Мабыць, яно мае права на існаваньне, калі ў Эўропе вылучана ў цэлую эпоху, пачатак якой прыпадае на канчатак Сярэдневечча. Тады яно не абмінула й Беларусь, новае адраджэньне ў Эўропу прыйшло ў эпоху нараджэньня капіталізму, калі пачалося канчатковае фармаваньне эўрапэйскіх нацыяў. Гэта калі паводле Маркса. Можна спрачацца пра гісторыка-філязофскае вызначэньне гэтага пэрыяду, але тое, што для нас ён пачаўся ў сярэдзіне мінулага стагоддзя — факт бясспрэчны. Ва ўсякім выпадку ён адзначыўся нараджэньнем новай, сучаснай культуры. Будавалася яна на нашай нацыянальнай традыцыі. Дастаткова параўнаць вершы Багушэвіча з фальклёрам, п´есы Дуніна-Марцінкевіча з інтэрмэдыямі тэатраў Радзівілаў, Агінскага, Тызэнгаўза, а музыку Манюшкі — са сьвецкай палацавай музыкай тых жа часоў.

Паўстае пытаньне: «Дык якое ж адраджэньне нам браць за традыцыю?»

Калі першае, дык тады мы сапраўды вяртаемся ў пачатак шляху. Калі разглядаць за аснову, так бы мовіць, другое адраджэньне, мы можам пэўным чынам весьці размову пра пераемнасьць і няспыннасьць традыцыяў. Але тут узьнікае магчымасьць паспрачацца з віленскімі адраджэнцамі. Сэнс у тым, што Менск у апошнія гады меў вядучае становішча ў беларускай культуры.

Размова ідзе пра разбурэньне, парушэньне традыцый. Так, архітэктура Менска страціла непараўнальна больш, чымсьці віленская. Але культура — гэта ня толькі й далёка ня столькі архітэктура. З Вільняй адбылася яшчэ горшая справа. Апошнія сто гадоў высьвятленьня таго, каму належыць гэты горад, адбывалася, на жаль, паміж палякамі й летувісамі. Беларусы тут прысутнічалі адно як недарэчныя назіральнікі. На Менск, тым часам, ніхто не прэтэндаваў. А таму нельга абвяшчаць голай саўдэпаўшчынай тое, што мы не пачуваемся ў Вільні дома. Таксама, як і ў Беластоку, Смаленску альбо Чарнобылі. Бязглузда прыходзіць да чужых людзей у хату, дзе ты некалі жыў, і даводзіць новым гаспадарам, што ты дома...

Новавіленчукі гавораць, што зараз будуць уздымацца рэгіянальныя цэнтры беларускай культуры, такія, як Горадня, Нясьвіж, Віцебск і г. д. Уласна я толькі чакаю таго моманту...

А цяпер хочацца ўзгадаць яшчэ адзін аспэкт праблемы. Шукальнікаў традыцыі умоўна можна падзяліць на дзьве плыні. Першыя — тыя, хто прызнае за пастулят, што нацыі беларускай няма, што яна так і не пасьпела (дакладней — ёй не далі) сфармавацца. Сярод іх ёсьць большыя альбо меншыя максімалісты, але ўсе яны шукаюць традыцыю ў якасьці асновы, вакол якой можа сфармавацца моцная эўрапэйская нацыя. Каталікі натхняюцца прыкладам палякаў, праваслаўныя зважаюць на расейцаў, вуніяты палітычнымі сродкамі хочуць аб´яднаць тых і другіх, сацыял-дэмакраты натхняюцца прыкладам былой статысячнай сацыял-дэмакратычнае Грамады.

Пазіцыя гэтая трымаецца на адмысловае трактоўцы вызначэньня нацыі, за якую выступае БНФ. Маецца на ўвазе, што нацыя — гэта супольнасьць людзей, аб´яднаных агульнай мовай, гэаграфічнай тэрыторыяй, агульнымі эканамічнымі й культурнымі сувязямі. На першае месца, як мне здаецца, тут ставіцца мова, яна лічыцца першачарговым вызначальным фактарам наяўнасьці нацыі. Пры гэтым зусім не ўлічваюцца моманты мэнтальныя. Дарэчы, першым вызначэньне нацыі ў такім выглядзе падаў Маркс альбо Ленін, якія, як той казаў, для нас — не аўтарытэт. Да ўсяго мы ячшэ маем прыклады, якія пасьпелі стаць банальнымі: ірляндцы й шатляндцы, якія маюць уласную багацейшую гісторыю, захавалі сваю мову, як і мы, амаль выключна ў культурным асяродку, што не перашкаджае ім усё жыцьцё ўпарта змагацца за поўнае самавызначэньне. Заўважу, што мала што зьмянілі нават дзесяцігоддзі моцнай нацыянальнай моўнай палітыкі ў Ірляндыі. Наадварот, немцаў прынята лічыць адной нацыяй, у той жа ж час тырольцы лепш разумелі неапалітанцаў, чымсьці жыхароў Кёльна альбо Ганновэра.

Другая плыня, да якой належаць пераважна віленскія адраджэнцы, лічыць, што беларусы — старая, даўно сфармаваная эўрапэйская нацыя. Для іх пошукі маюць адзіную мэту — вывесьці беларускую культуру на агульнаэўрапэйскі, агульнасусьветны агляд. Мэта, безумоўна, высакародная. Ажыцьцяўляць яе можна ў трох накірунках. Першы — збор, апрацоўка, асэнсаваньне й выданьне ўсяе нашае спадчыны. Другі — стварэньне ўласнае школы сусьветнае культуры праз пераклады, г. зн. асэнсаваньне яе на сваім мэнтальным узроўні. Трэйці — стварэньне новае, сучаснае культуры сусьветнага узору. У нас пакуль што амаль нічога гэтага няма.

(Працяг на 6-й стар.).

Гарадзенскі акуліст Лазар Замэнгоф

(Працяг. Пачатак на 3-й стар.).

значыцца, што акуліст Л. Замэнгоф пражываў у Горадні. «Гарадзенскія губэрнскія ведамасьці» нагадваюць аб тым, што калісьці Беласток быў правінцыйным гарадком Гарадзенскай губэрні. Фактычна, Гарадзеншчына зьяўляецца радзімай стваральніка міжнароднай мовы Эспэранта. З 1893 года па 1894 Л. Замэнгоф жыў і тварыў у нашым горадзе. Гэты факт актывізуе рух эспэрантыстаў Гарадзеншчыны. Пры аспэранта-клюбе г. Слоніма арганізаваны курсы мовы Эспэранта для бібліятэкараў. Авалодаўшы Эспэранта, яны стануць прапагандыстамі міжнароднай мовы для насельніцтва.

Эспэранта-клюб з цікавай назвай «Джардэна» («Сад») працуе пры дзіцячым садку № 82 г. Горадні. Выхавацелькі з дапамогай гульняў, вершаў, лічылак, песьняў вучаць дзяцей старэйшых груп мове Эспэранта. Тое, што Эспэранта — мова дружбы паміж людзьмі ўсяго сьвету, маленькія эспэрантысты ўжо спазналі на практыцы. У сакавіку адбылася сустрэча дзяцей з далёкім замежным госьцем — эспэрантыстам з Аргеньціны. Прафэсар Атыліё Фелана Рояс знаёміўся з дзецьмі на Эспэранта, й тыя трапна адказвалі на пытаньні, хто яны й дзе жывуць.

Эспэранта вывучаюць васьміклясьнікі СШ № 26 г. Горадні. Тут арганізавана Эспэранта-група «Зялёны ветразь». Зялёны колер — колер жыцьця. Зялёны штандар і зялёная зорка з літарай «Э» («Эспэранта») — асноўная сымболіка эспэрантыстаў усяго сьвету.

Эспэрантысты Гарадзеншчыны актыўна ўдзельнічаюць у рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных сустрэчах эспэрантыстаў, самі ладзяць такія сустрэчы. 15—16 сьнежня 1991 года Міжнародная сустрэча эспэрантыстаў адбылася на турбазе «Нёман», у ёй ўдзельнічалі 120 дэлегатаў з 25 гарадоў Беларусі, Летувы, Латвіі, Расеі, Украіны, Узбэкістана, Польшчы.

Аб міжнароднай сустрэчы эспэрантыстаў у Горадні, аб мэмарыяльнай дошцы з надпісам на дзьвюх мовах, беларускай і эспэранта, устаноўлена й у дзень нараджэньня стваральніка міжнароднай мовы Л. Замэнгофа, быў зьмешчаны вялікі артыкул у цэнтральным часопісе «Эспэранта». Пазьней быў надрукаваны ў гэтым жа часопісе фотаздымак дома, у якім жыў Л. Замэнгоф.

Ад імя эспэрантыстаў Рэспублікі Беларусь напісаны зварот у камісію па перайменаваньню вуліц з прапановай надаць вул. Кірава імя стваральніка міжнароднай мовы Л. Замэнгофа або Эспэранта. Добра было б прымеркаваць гэта да Міжнароднай сустрэчы эспэрантыстаў, прысьвечанай гісторыі Эспэранта — руху на Беларусі, якая адбудзецца ў верасьні і на якую зьбіраюцца прыехаць замежныя госьці з Англіі й Амэрыкі.

Л. ВОЎКАВА,
старшыня Асацыяцыі эспэрантыстаў Рэспублікі Беларусь.

ЛІТАРАТУРА. ПЕРАКЛАДЫ

Гайнрых БЁЛЬ

Успаміны маладога караля

Ад перакладчыка:

Перабіраючы свае **архівы, я знайшоў гэты пераклад апавяданьня Гайнрыха Бёля.** Рабіў я яго яшчэ будучы студэнтам перакладчыцкага факультэта Менскага інстытута замежных моў, а было гэта ў год прысуджэньня Бёлю Узнагароды Нобэля. Аднак у тыя часы вядомы нямецкі пісьменьнік быў у савецкай няласцы, вядома, пра публікацыю перакладу не было й мовы, апавяданьне Гайнрыха Бёля прапаную ўвазе чытачоў «Пагоні».

Уладзіслаў Струміла.
г. Вільня.

Калі мне споўнілася 13 гадоў, я стаў каралём Капоты. Я сядзеў якраз у сваім пакоі і сьціраў «не» у слове «незадавальняюча», якое стаяла ў канцы майго заданьня. Мой бацька Піг Гі I, кароль Капоты, выбраўся на чатыры тыдні ў горы на паляваньне, і заданьне мне трэба было паслаць кур ´ерам. Я разьлічваў на дрэннае асьвятленьне ў паляўнічых павільёнах, аднак старанна выціраў «не», і ў гэты час да мяне данёсься моцны крык з вакна:

— Няхай жыве Піг Гі II

Праз хлівіну ў пакой увайшоў мой камэрдынэр, ужо на парозе ўпаў на калені й прашаптаў:

— Няхай прабача Ваша Каралеўская Вялікасьць, што я паведаміў пану прэм ´еру аб той папяросе Вашай Каралеўскай Вялікасьці.

Паводзіны камэрдынэра мне не спадабаліся, я загадаў яму выйсьці, а сам зноў заняўся няшчасным «не». Мой хатні настаўнік ставіў адзнаку заўсёды чырвоным чарнілам. Церучы па адным месцы, я зрабіў у сшытку дзірку. У гэты час мне зноў перашкодзілі. Увайшоў прэм ´ер, у дзьвярах стаў на калена і ўсклікнуў:

— Няхай жыве Піг Гі II, няхай жыве, няхай жыве! — Пасьля чаго ён дадаў: — Ваша Каралеўская Вялікасьць, люд хоча Вас бачыць!

Нічога не разумеючы, я адлажыў у бок сьцірку, строс з рук пыл і запытаў:

— Чаму люд хоча мяне бачыць?

— Бо Вы — кароль.

— З якога часу?

— Паўгадзіны таму надаз Вы сталі каралём. Яго Каралеўская Вялікасьць, Вашага бацьку, застрэлілі на паляваньні Шасакі. (Шасак — скарочаная назва ад «шалёны садыст Капоты).

— Ох, гэтыя Шасакі!

Пасьля чаго я пайшоў усьлед за прэм ´ерам і, стаўшы на балконе, паказаўся народу. Вельмі заклапочаны, я толькі ўсьміхаўся і махаў рукамі.

Спантанная дэманстрацыя працягвалася каля дзьвюх гадзін. Толькі вечарам, калі пашарэла, народ разыйшоўся, аднак праз некалькі гадзін ён зноўку прайшоў перад палацам — на гэты раз то быў паход з паходнямі.

Я пайшоў у свой пакой, парваў сшытак з заданьнямі і шматкі паперы выкінуў на ўнутраны падворак палацу. Там, як я даведаўся пасьля, іх сабралі зьбіральнікі памяткаў і прадалі ў чужыя краіны ´, дзе да сёньняшняга дня захаваліся довады маёй слабой арфаграфіі.

Пачаліся месяцы цяжкай працы. Шасакі спрабавалі арганізаваць путч, аднак Дасакі (дабрадушныя садысты Капоты) і армія путч задушылі. Калі бацька быў пахаваны, адбылася мая каранацыя ў Капоцкім саборы. Цяпер я быў вымушаны прымаць удзел у паседжаньнях парлямэнту і падпісваць розныя паперы, аднак увогуле быць каралём мне падабалася, бо ў стасунку да майго хатняга настаўніка я мог прыбягаць да мэтадаў, якія я не стасаваў раней.

Калі на ўроку ён пытаў у мяне:

— Ці ня скажа мне Ваша Каралеўская Вялікасьць, якія правілы існуюць для няправільных дробаў?

Я адказваў:

— Не скажу.

І настаўнік нічога ня мог зрабіць. Калі ён гаварыў:

— Ці лічыла б Ваша Каралеўская Вялікасьць рэчай нязноснай, калі б я папрасіў, каб Вы напісалі, якімі матывамі кіраваўся Вільгельм Тэль, забіваючы Гэсснера?

Я адказваў:

— Так, я лічыў бы гэта нязноснай рэчай.

І я патрабаваў, каб ён сам пералічыў матывы. Вось такім чынам, зусім бяз цяжкасьцей, я прайшоў поўную адукацыю. Я спаліў усе падручнікі і сшыткі і аддаўся сваім улюбёным забавам: гуляў у мяч, кідаў у дзверы сьцізорык, чытаў дэтэктывы і прысутнічаў на доўгіх канфэрэнцыях з кіраўнікамі кіна пры двары. Я загадаў, каб былі закуплены ўсе мае любімыя фільмы, а ў парлямэнце я выступіў са школьнай рэформай.

Гэта быў цудоўны час, хоць мне і надакучвалі паседжаньні парлямэнту. Мне ўдавалася гуляць ролю маладога мэлянхалічнага караля. Я цалкам паклаўся на прэм ´ера Пэльцэра, які быў сябрам бацькі і сваяком маці-нябожчыцы.

Прайшло тры месяцы, і Пэльцэр захацеў, каб я ажаніўся. Ён сказаў:

— Ваша Каралеўская Вялікасьць павінна даваць прыклад.

У прынцыпе я не баяўся жаніцьбы, дрэнным было толькі тое, што Пэльцэр прапанаваў мне сваю адзінаццацігадовую дачку Гэдвіг — малую худую дзяўчынку, якую я часта бачыў з мячыкам у двары. Яна была, мабыць, крыху дурнаватай, бо другі год сядзела ў пятай клясе. На выгляд — вельмі сярдзітая. Я выпрасіў сабе час на роздум, трапіў у сапраўдную мэлянхолію, цэлымі днямі сядзеў ля вакна і прыглядаўся да Гэдвіг, якая або кідала мячык, або скакала. Цяпер яна была крыху менш апранута, ад часу да часу паглядала ў мой бок і усьміхалася. Аднак усьмешка яе мне выдавалася несапраўднай.

Калі мінуў час, вызначаны на роздум, Пэльцэр зьявіўся перада мной у сваім выйсьцёвым муньдзіры — вялікі чалавек з жоўтым тварам, чорнай барадой і вачамі, якія блішчэлі.

— Ці можа Ваша Каралеўская Вялікасьць паведаміць мне аб сваім рашэньні? — запытаў ён.— Ці маё дзіця знайшло пяшчоту ў вачах Вашай Каралеўскай Вялікасьці? А калі я сказаў коратка «не», здарылася нешта страшнае. Пэльцэр сарваў эпалеты, а свой партфэль прэм ´ера — быў ён са штучнай скуры — кінуў мне пад ногі, пачаў вырываць з барады валасы і крычаць:

— Вось як выглядае ўдзячнасьць каралёў Капоты!

Я апынуўся ў няёмкай сітуацыі. Бяз Пэльцэра я прапаў. Хутка зарыентаваўшыся, я сказаў:

— Я прашу рукі Вашай дачкі Гэдвіг.

Пэльцэр упаў перада мной на калені, пачаў цалаваць мае ногі, пасьля падняў эпалеты і партфэль са штучнай скуры.

Шлюб мы ўзялі ў саборы ў Вружкове. Людзям былі раздадзены хлеб і каўбаса і па майму загаду па два білеты на карузэлю. Восем дзён крыкі й гоман панавалі ў сьценах палацу.

З гэтага часу я дапамагаў Гэдвіг рабіць арыфметыку, мы разам гулялі ў мяч, вучыліся скакаць праз вяровачку, разам езьдзілі конна і заказвалі сабе вату з цукру або йшлі ў кіно пры двары, калі нам толькі хацелася. Быць каралём мне падабалася, аднак нечаканы выпадак падвёў апошнюю крэску ў маёй кар ´еры.

Калі мне споўнілася 14 гадоў, мяне прызначылі каманьдзірам 8-га палка, надаючы званьне палкоўніка. Гэдвіг стала маёрам. Цяпер мы павінны былі ад часу да часу праязджаць перад фронтам палка, прымаць удзел у вячэрах у Касыне і падчас урачыстых сьвят прышпільваць ордэны на грудзях заслужаных салдат. А пасьля здарылася гэтая гісторыя з Паскопакам.

Паскопак, салдат чацьвёртага эскадрону майго палка, у адзін суботні вечар дэзэртаваў, каб усьлед за нейкай цыркавой артысткай павандраваць у другую краіну. Яго, аднак, схапілі і пасадзілі ў турму, пасьля чаго вайсковы трыбунал прыгаварыў яго да пакараньня сьмерцю. Мне як камандзіру палка трэба было падпісаць прысуд, аднак я толькі напісаў: «Прыгавор зьмяніць на 14 дзён турмы. Піг Гі II». Гэтыя некалькі слоў і «заварылі кашу». Афіцэры майго палка ўсе да аднаго пазрывалі свае эпалеты й загадалі маладому паручніку рассыпаць іх у маім пакоі. Ордэны яны таксама пазрывалі. Уся армія Капоты далучылася да бунту, такім чынам вечарам мой пакой быў завалены эпалетамі і ордэнамі. Карціна была ня з лепшых.



Людзі, праўда, крычалі ў мой адрас «віват», аднак яшчэ ў тую ж самую ноч Пэльцэр паведаміў мне, што ўся армія перайшла на бок Шасакаў. Быў чутны крык і стрэлы, дзікі трэск аўтаматаў разьдзіраў цішыню. Дасакі, праўда, прыслалі мне асабістую стражу, але на працягу ночы Пэльцэр перайшоў на бок Шасакаў, такім чынам я разам з Гэдвіг вымушаны быў уцякаць. Мы забралі з сабой вопратку, грошы і сэртыфікаты, Дасакі прыслалі таксі, і нам з вялікімі цяжкасьцямі ўдалося даехаць да пагранічнай станцыі, дзе мы ўжо амаль без сілы селі у спальны вагон другой клясы і паехалі на захад. На граніцы Капоты былі чутны стрэлы й дзікія крыкі — страшэнная музыка бунту.

Ехалі мы чатыры дні і сышлі ў горадзе, які называўся Пялюшкава. Пялюшкава (гэта я ўспомніў урок гэаграфіі) было сталіцай суседняй краіны.

Тым часам Гэдвіг і я пазнавалі рэчы, якія навучыліся цаніць: горкі пах чыгункі, смак сардэлек на чужых вакзалах, акрамя таго, я мог курыць, колькі пажадае мая душа. Гэдвіг жа, якой ня трэба было рабіць школьныя заданьні, расквітала на вачах.

На другі дзень нашага прыезду ў Пялюшкава, у горадзе пачалі расклейваць вялікія афішы, на якія мы адразу зьвярнулі ўвагу: «Цырк Хупкэ. Славутая артыстка Гуля са сваім партнёрам Юргэнам Пасткопам». Гэдвіг тут жа ўсклікнула:

— Піг Гі, падумай аб нашым жыцьці. Паскопак табе дапаможа.

У нашую гасьціницу кожную гадзіну прыходзілі тэлеграмы з Капоты, у якіх паведамлялася аб перамозе Дасакаў, сьмерці Пэльцэра, рэарганізацыі войска. Новы прэм ´ер — называўся ён Шмідт — і быў кіраўніком Дасакаў, прасіў мяне, каб я вярнуўся і з рук народа ізноў прыняў жалезную карону каралёў Капоты.

Я вагаўся некалькі дзён, але нарэшце перамог страх Гэдвіг перад школьнымі заданьнямі. Такім чынам, я пайшоў у «Цырк Хупкэ» і сказаў, што хачу паразмаўляць з Паскопакам. Прыняўён мяне з вялікай радасьцю.

— Мой збавіцель! — усклікнуў ён, стоячы ў дзьвяраў свайго вагончыка.— Што я магу для Вас зрабіць?

— Мы хочам жыць,— проста сказаў я.

Паскопак расказаў пра мяне Хупкэ. Я пачаў прадаваць у цырку спачатку ліманад, потым папяросы, затым гуляш. Атрымаў свой вагончык. Праз некаторы час я стаў касірам. Узяў іншае прозьвішча — Цюкэ. Вільгельм Цюке. І з гэтага часу тэлеграмы з Капоты мне перасталі прысылаць.

Там лічаць, што я памёр, загінуў, а я тым часам вандрую з расквітаючай Гэдвіг па сьвеце ў цыркавым вагончыку. Удыхаю ў сябе пах чужых краін, бачу іх, цешуся вялікай павагай у Хупкэ. І калі б ня тое, што ад часу да часу да мяне прыходзіць Паскопак і расказвае пра Капоту, калі б не яго жонка, чароўная артыстка Гуля, якая кожны раз паўтарае мне, што муж яе жыве дзякуючы мне, я б зусім не памятаў аб тым, што калісьці быў каралём.

Аднак нядаўна я знайшоў сапраўдны доказ майго колішняга каралеўскага жыцьця. Мы былі якраз на гастролях у Мадрыдзе, і ранкам я з Гэрвіг гуляў па горадзе. Вялікі шэры будынак з надпісам «Народны музэй» прыцягнуў нашую ўвагу.

— Зойдзем,— сказала Гэдвіг.

Мы ўвайшлі ў адну вялікую залу, якая знаходзілася крыху збоку і над якой была бачна шыльдачка «Палеаграфія». Нічога не прадчуваючы, мы разглядалі паперы розных прэзідэнтаў і каралёў і дайшлі, нарэшце, да шкляной вітрыны, на якой была наклеена белая вузкая картачка «Каралеўства Капоты, ад двух год рэспубліка». Я ўбачыў паперы свайго дзеда Вука II-га, кавалак вядомага Маніфэсту Капоты, які ён сам склаў, знайшоў таксама картку з паляўнічага дзёньніка майго бацькі, а ў канцы картку з ўласнага сшытку — кусок бруднай паперы, на якім я прачытаў: «Жабы квакаюць у рацэ». Я сарамліва павярнуўся да Гэдвіг, але яна толькі усьміхнулася і сказала:

— Гэта было калісьці.

Мы хуценька выйшлі з музэя, бо была ўжо першая гадзіна. А трэцяй пачыналася прадстаўленьне, а другой гадзіне мне трэба было адчыняць касу.

Вайсковая спэцыяльнасьць не да густу

Яшчэ нядаўна спэцыяльнасьць кадравага вайскоўца была паважанай сярод гарадзенскай моладзі. Толькі за апошнія тры гады ў вайсковыя вучэльні, якія разьмешчаны ча тэрыторыі сувэрэннай Беларусі і за яе межамі, выказвалі жаданьне паступаць што год прыкладна 40 выпускнікоў школ і ПТВ. Аднак сёлета гэтая лічба значна зьменшылася. Пакуль што атрымаць прафэсію вайскоўца пажадалі толькі тры юнакі ў Гарадзенскім раёне.

Г. В.

КАНФЭСІІ

З 1937-м годам, сябры!

На паліцах кнігарняў зьявілася кніжка пад назовам «Храналогія гісторыі Беларусі», выдадзеная ў серыі «Энцыклапедычная бібліятэчка «Беларусь». Як пазначана на вокладцы, гэта «3-е выданьне, перапрацаванае і дапоўненае». Варта дадаць, што першае было надрукавана ў 1982-м годзе. Як нас запэўніваюць «складальнікі», у новым выданьні «больш поўна адлюстраваны падзеі на Беларусі...». З гэтым нельга не пагадзіцца. У кніжцы, дзе на вокладцы недарэчна суседзяць Пагоня й былы асноўны гонар беларусаў — шматтонны БелАЗ, сапраўды зьявіліся згадкі пра бітву пад Воршай і (які жах!) нават пра 25-га сакавіка 1918 года. Але гэта ўсё, як той казаў, касмэтыка.

Непарушнай застаўся галоўны саўдэпаўскі падзел нашае гісторыі: 57 старонак асьвятляюць падзеі ад дагістарычнага пэрыяду (першая згадка пра 100—40 тысячаў гадоў таму) і да сумнавядомага 1917 году. На пэрыяд ад 17-га году й да 30-га сьнежня 1991 году прыпадае 136 старонак. Але вы не падумайце, што я заклікаю ўкладальнікаў зьменшыць прапорцыі. Ім яе трэба павялічваць да бязконцасьці, бо яны проста вырашылі «не кранаць сьвятое». Я магу гэта даказаць. Паважаныя чытачы, хочаце даведацца, якімі галоўнымі датамі, напрыклад, вызначаецца для беларусаў 1937 год? Калі ў вас няма кніжкі пад рукою, я думаю, мне варта працытаваць гэты разьдзел цалкам. Тым больш, што шмат месца гэта ня зойме:

«1937 год.

Усебеларуская нарада жанчын-трактарыстак.

Усебеларуская нарада ініцыятараў стаханаўскага руху.

Апублікаваньне праэкта Канстытуцыі БССР для ўсенароднага абмеркаваньня.

Працяг работы 12-га (надзвычайнага) Усебеларускага з'езда Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў; прыняцьце новай Канстытуцыі БССР (19.2.1937 г.)

Рэспубліканская нарада перадавікоў сельскай гаспадаркі. 16-ы з'езд КП(б)Б.

Узнагароджваньне Менскага фізкультурнага тэхнікума ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцяга.

Выйшаў 1-ы нумар газеты «Советская Белоруссия» — орган ЦК КП(б)Б.

Выстаўка «БССР за 20 год», прысьвечаная 20-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Выбары ў Вярхоўны Савет СССР 1-га скліканьня.

Пабудавана 1-я чарга Аршанскага льнокамбіната».

Як кажуць у такіх выпадках: «камэнтары не патрэбны». Але я ўзяў нават адсюль карысную інфармацыю, якой, па ідэі, павінны зацікавіцца й тыя, хто выдае «Кнігу рэкордаў Гінэса». Ва ўсялякім выпадку я цяпер ведаю, што праэкт канстытуцыі можна «усенародна абмеркаваць» крыху болей, чым за два тыдні.

У прадмове «складальнікі і рэдактары кнігі» пішуць пра тое, што «з удзячнасцю прымуць усе слушныя заўвагі па ўдасканаленьню і дапаўненьню храналогіі і ўлічаць іх пры падрыхтоўцы новых выданьняў». У мяне будзе толькі адно слушнае й грунтоўнае пажаданьне: «Хлопцы, кіньце вы гэтую справу!».

Я. ДУБРОЎСКІ,
г. Менск.

Нехадавы тавар

Аж ахнулі ад зьдзіўленьня Берасьцейскія мытнікі, калі нарэшце вырашылі праверыць зьмесьціва пяці вялікіх тэрмасаў у турыста Б., які ад'язджаў у суседнюю Польшчу. Замест гарачай кавы ці гарбаты перад вачыма мытных кантралёраў блішчэлі чырвоныя коркі літровых бутэлек сьпірту «Гаспадзін».

Дарэчы, «няўдалы» турыст ужо працяглы час езьдзіць да Польшчы з гэтымі тэрмасамі і заўжды казаў інспэкцыі, што тэрмасы — нехадавы тавар на торжышчы суседняй краіны, але яму няма чаго болей везьці.

Г. КРЫВЕЦ.

На фэсьце ў Жыровічах

Невялічкі пляц перад Сьвятажыровіцкім кляштарам быў запоўнены легкавікамі так, што нават пешшу праціснуцца было цяжка. А машыны ўсё пад'язджалі й пад'язджалі. Тыя, каму не хапіла месца на пляцы, паркавалі свае транспартныя сродкі проста на бліжэйшых вуліцах. Углядаюся ў нумары легкавікоў і здзіўляюся. Божухны, здаецца, ўвесь сьвет зьехаўся сюды, ў Жыровічы. Якіх тут толькі машын не сустрэнеш! Вось прынініліся гуртам легкавікі з Берасьцейшчыны, а там, непадалёк, цэлым шэрагам у сутоньні ліпаў стаяць аўтобусы з літарамі «МИА», «МГБ», «РВГ», «ВТД». Калі пачынаеш праціскацца скрозь гэтыя бліскучыя шыхты, заўважаеш, што нямала гасьцей даехала да нас з Летувы, Латвіі, Расеі, Польшчы.

Усе, хто прыехаў, апрануты ў сьвяточныя строі, настрой іх узьняты. Людзі нетаропка накіроўваюцца да галоўнай брамы кляштара, пры сутыкненьнях ветла ўсьміхаюцца адзін аднаму ці робяць выгляд, што нічога не здарылася.

На прыступках галоўнай царквы кляштара (усіх іх пяць) гасьцей вітаў Мітрапаліт Менскі й Слуцкі Філярэт, ля яго стаяць іншыя чыны праваслаўнай царквы на Беларусі. Побач іх заўважаю ўладыку Гарадзенскага й Ваўкавыскага Валяньціна. Паводдаль іншыя сьвятары, манахі й манашкі. Мітрапаліт Менскі й Слуцкі Філярэт пачынае пералік ганаровых гасьцей. Сярод іх чую нават імёны прадстаўнікоў праваслаўнай дыяспары з Ташкента, Сібіры, Масквы, Кіеву.

Расчыняецца брама, й сьвятары разам з гасьцямі ідуць ў глыбкі храма, бліжэй да алтара. За імі пачынаюць рух манахі, вернікі, проста ахвочыя. Усе нясуць у руках кветкі — пераважна ружы — і складаюць іх пад вабразы сьвятых моляцца. Папераць царквы хутка запаўняецца натоўпам. Людзей набіраецца столькі, што праціснуцца ці хоць паварушыць рукой амаль немагчыма.

Пачынаецца набажэнства, яго вядзе Мітрапаліт Менскі й Слуцкі. Па храму разносяцца словы імшы «возлюби ближнего своего, не дай зачерстветь душе. Воздавай дань богу и сыну его Иисусу». Хор падхоплівае ўрачыстыя словы набажэнства. Уяўленьне такое, што быццам трапіў у сьвет, які напоўніўся прыгажосьцю, дабрынёй, і будзе такім вечна. Набажэнства набірае моцы, віруе па ўсіх кутах душы. На вачох некаторых вернікаў сьлёзы. З трэскам гараць васковыя сьвечкі, ладан. Чуюцца словы сьвятой малітвы аб пакаяньні.

Непадалёк мяне на прыступках алтара рыхтуецца працэсія з харугвамі. На чале яе гуртуюцца сьвятары, пачынаецца шэсьце. Людзі, якім не хапіла месца ў храме, вітаюць працэсію. Да іх са словамі вучэньня Божага зьвяртаецца Мітрапаліт. Ён нагадвае ўсім, што больш як 400 год на сьвятую зямлю Беларусь у Жыровічах ступіла нага Багародзіцы прыснадзевы Марыі. Гэта сьведчаньне таго, што Багародзіца зьяўляецца заступніцай зямлі беларускай. І, можа, толькі дзякуючы яе абароне, мы, дзеці зямлі беларускай, выжылі, вытрывалі й пачалі адраджацца.

Г. АСТРОЎСКІ,
Горадня — Жыровічы.

Для аздараўленьня дзяцей

Экалягічны цэнтр створаны нядаўна на кафэдры дзіцячых хвароб пры Гарадзенскім клінічным дзіцячым шпіталі. Цэнтр мае на мэце выяўленьне чыстых зонаў на тэрыторыі ўсёй рэспублікі й стварэньне на гэтых плошчах санаторыяў і дамоў адпачынку для дзяцей, пацярпеўшых ад аварыі на ЧАЭС.

Г. У.







Вокны. **Фатаграфаваў А. УЛАДАСЕВІЧ.**

Краязнаўчы музэй

(Пачатак на 4 стар.).

Але ў любой сітуацыі, нават самай дрэннай, ёсьць свае плюсы. Так, мы не стварылі сваёй панарамнае культуралягічнае ды гістарыяграфічнае карціны. Але мы й не стварылі нявартых падробак, накшталт тэлефільма Летувіскае тэлевізіі пра «караля Міндаўгаса й ягонага сына Войшвілкаса ў каралеўскім замку Ворутэ», які паказалі па Астанкіна ў день незалежнасьці Летувы...

Вернемся аднак да нашае размовы пра пошукі традыцыі. Амаль усе заходнія творчыя асобы сцьвярджаюць, што вялікі ўплыў на іхнюю творчасьць аказалі такія расейскія пісьменьнікі, як Дастаеўскі, Талсты, Чэхаў. Сярод нашай беларускай інтэлігенцыі назіраецца такая акалічнасьць: адны таксама чытаюць вышэй названых пісьменьнікаў, а таксама Салаўёва, Бярдзяева й г. д., другія непараўнальна больш бяруць менавіта ад тых, хто карыстаўся творамі гэтых аўтараў пад час сваіх ідэйных пошукаў. Гэта Борхэс, Картасар, Сартр, Камю й шмат хто іншы. Як пісаў Ігнат Абдзіраловіч яшчэ ў дваццатыя гады, беларусы ўвабралі ў сябе як чыста заходні прагматызм, так і ўсходнюю «шырату душы».

Адразьвіцьці ці адраджэньні культуры. Калі гаварыць пра разбурэньне традыцыяў, дык у гэтым сэнсе правінцыя, а дакладней былыя цэнтры культуры — Тураў, Полацк, Ворша, Клецак і г. д.— страцілі непараўнальна больш, чым Менск. Яшчэ Імануіл Кант пісаў, што культура — гэта ня толькі й ня столькі традыцыя, але яшчэ й творчасьць. Самае страшнае тое, што ў правінцыі была пабурана ня толькі культурная традыцыя, але амаль цалкам зьнішчаны творчы асяродак. І якім бы наступствам сацыялістычнае гіпэрцэнтралізацыі не было тое, што асноўная й пераважная большасьць творцаў жыве ў Менску, гэта — рэчаіснасьць. Хоць колькасьць і якасьць — рэчы не сінанімічныя, тым ня менш творчы патэнцыял Менска застаецца велізарным. Лішне казаць, што ідэя культуровае экспансіі нашае былой сталіцы — Вільні, нарадзілася таксама менавіта тут...

Канешне, усё залежала ад пункту гледжаньня на тое, што маецца пад паняцьцем уласна беларускае культуры. Узяць, напрыклад, беларускі балет. З пазіцыі адраджэнцаў ён, атрымліваецца, не наш, бо пабудаваны па агульнае клясычнае схэме, але не на традыцыях былых тэатраў Радзівілаў, Агінскага, Тызэнгаўза. Але ў адным з інтэрв'ю кіраўнік балету Валяньцін Елізар'еў, сам не беларус, на пытаньне, чаму ён не размаўляе па-беларуску, пакпіў: атрымліваецца, што хлеб чужы ем? Але ж я стварыў у вас балет, які ня сорамна паказаць на любой пляцоўцы сьвету. Гэта хіба ня лічыцца?

Адно — аднаўляць традыцыі, іншае — займацца ўласнай творчасьцю. І ня варта спрабаваць вызначыць, што больш істотна. І тое, й другое разам складаюць адно цэлае — беларускую культуру. А вынік залежыць толькі ад таленту й прафэсіяналізму тых, хто гэтым займаецца. Дык давайце ж лепш ня будзем спрачацца, а кожны хай шчыра робіць сваю справу.

Алесь АСТРАЎЦОЎ,
г. Менск.

31, ПОНЕДЕЛЬНИК

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

9.00. Пад купалам сусвету. **9.15.** «Мачаха». Мастацкі фільм. **16.30.** Тэлевізійны дом кіно. **18.00.** «Дзённік Прынёмання». (Гр.). **18.25.** Спадчына. (Гр.). **19.00.** Абласныя навіны (Брэст). **19.10.** Не абы-што. **19.40.** Веснік гарсавета. (Гр.). **20.05.** «Радар». Пра бяспеку руху. (Гр.). **20.25.** Служба «01». Выступленне начальніка галоўнага ўпраўлення пажарнай аховы МУС Беларусі генерал-маёра унутранай службы В. П. Астапава. **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.35.** Спартыўны тэлекур ер. **22.00.** І Беларускі фестываль песні і паэзіі. «Максім». Рок-опера. Пасля заканчэння — НІКа; Мастацкі фільм «У смерці дрэнная слава»; Пад купалам сусвету.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Новости. **5.20.** Утренняя гимнастика. **5.30.** Утро. **7.45.** Фирма гарантирует. **8.20.** Посмотри, послушай. **8.40.** «Зимняя сказка». Телеспектакль для детей. **10.20.** Мультфильм. **10.30, 17.35.** Гол. **12.20.** Премьера художественного телесериала «Горячев и другие». 17-я и 18-я серии. **14.25.** Телемикст. **15.10.** Блокнот. **15.15.** «Пчела Майя». Мультфильм. **15.40.** Играет В. Араораилов (аккордеон). **16.50.** Сделано в Индонезии. **16.20.** Звездный час. **17.25.** Технодром. **18.05.** Погода. **18.10.** Бросайте и выигрывайте. **18.40.** Эхо недели. **19.10, 20.40.** «Горячев и другие». 17-я и 18-я серии. **19.40.** Спокойной ночи, малыши! **21.10.** О чем молчат писатели. **22.20.** «Новая студия» представляет: Бомонд, Жизнеописание, Монтаж, Здравствуйте, Джем-сейшн. **00.00.** Пресс-экспресс.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00. 13.00, 19.00, 22.00. Вести. **7.25.** Время деловых людей. **7.55.** Параллели. **8.10.** Шарман-шоу. **9.40.** «Дела семейные». К Международному дню защиты детей. **10.10.** Устами младенца. **10.40.** «Живая конституция». Документальный фильм из цикла «Власть на согласии». (США). **11.10.** «Магия черная и белая». Художественный фильм. **12.25.** Досуг. **12.40.** Крестьянский вопрос. **13.25.** «Жертва войны». Художественный фильм. **15.05.** Премьера документального фильма «Дикая природа Америки». (США). **15.35.** Там-там-новости. **15.50.** «Семья Смирновых — как жить дальше». Размышления над письмами. **16.10.** Трансросэфир. **16.55.** Соотечественники. **17.25.** Спасение 911. **18.20.** Бизнес в России. **18.45.** Праздник каждый день. **19.25.** Художественный фильм «Схватка в Лас-Вегасе» (США). **20.20.** Ретро-шлягер. **20.50.** Экран криминальных сообщений. **21.00.** Момент истины. **22.20.** Автомиг. **22.25.** Звезды говорят. **22.30.** Спортивная карусель. **22.35.** Не быть динозавром. **22.50.** На сессии ВС Российской Федерации. **23.05.** Каунтдаун. **00.05.** «Ролан Гаррос». Теннисный турнир.

ПОЛЬША-І

7.00. Кофе или чай. **10.00.** Новости. **10.10.** Мама и я. **10.25.** Дошкольники дома. **10.50.** Поговорим о детях. **11.05.** «Династия». Серия 191. **11.50.** Право на каждый день. **12.00.** Школа для родителей. **12.20.** Дети это любят. **12.30.** Театр или мир. **13.00.** Новости. **13.10.** Программа дня. **13.15.** «Спэйтз». Сериал пр-ва Англии. **13.40.** Английский язык для детей. **13.45.** Фильм на немецком языке. **14.15.** Историческая программа. **15.30.** Чрезвычайный пересмотр. **16.00.** Сенсации XX века. **16.30.** Презентация. **17.00.** Программа дня. **17.05.** Программа для подростков. **17.50.** Музыкальная программа. **18.00.** Телеэкспресс. **18.25.** «Спэйтз». Сериал пр-ва Англии. **18.50.** Антенна. **19.10.** Сатирическая программа. **19.20.** Наши рядом с нами. **20.00.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **21.00.** Миниатюры. **21.15.** Телетеатр. **23.05.** Сентиментальные встречи. **23.30.** Прямо из Бельведера. **23.45.** Новости. **00.00.** Музыкальная программа. **00.10.** Сериал пр-ва Англии. **01.10.** Горячая линия. **01.20.** Концерт. **02.15.** «Лорка — смерть поэта». Сериал пр-ва Испании. **03.45.** Спортивная студия.

ПОЛЬША-ІІ

09.00. Панорама. **09.05.** Местная программа. **09.35.** «Таинственное золото города». Мультсериал. **10.00.** Студия второй программы. **10.10.** «Поколения». Сериал пр-ва США. **10.35.** Женский журнал. **11.05.** Развлекательная программа. **11.35.** Хобби. **12.00.** Панорама. **12.05.** Студия второй программы. **12.10.** Спортивная программа. **13.00.** Студия второй программы. **13.10.** Час откровения. **14.00.** Панорама. **14.05.** «400 замыслов Вирджинии». Сериал пр-ва Франции. **15.00.** Музыкальный сериал. **16.00.** Документальный сериал. **16.55.** Программа дня. **17.00.** Развлекательная программа. **17.30.** Панорама. **17.35.** Спорт. **17.50.** «Таинственное золото города». Мультсериал. **18.15.** Обзор кинохроник. **18.50.** Польская кинохроника. **19.00.** Местная программа. **19.30.** Панорама. **19.35.** «Поколения». Сериал пр-ва США. **20.00.** «Наш век». Документальный сериал. **21.00.** «Алло, алло». Сериал пр-ва Англии. **21.30.** Автожурнал. **22.00.** Панорама. **22.30.** Спорт. **22.40.** Без обезболивания. **23.00.** «Побег из Ковры». Сериал пр-ва Австралии. **00.00.** «997». Криминальная хроника. **01.00.** Панорама. **01.10.** Спортивная студия.

1, ВТОРНИК

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. **8.10.** Пад купалам сусвету. **8.25.** «Пяюць сярэбраныя трубы». Фільм-канцэрт. **8.45.** «У добры час». Выступленне міністра народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь В. А. Гайсенка. **8.55.** Тэлебачанне — школе. **9.00.** «Апошняя вясною». Музычны фільм. **9.30.** Якія мы гаспадары? **10.15.** «Залаты рынг». Шоу-праграма. **11.25.** Не абы-што. **11.55.** Мастацкі фільм «У смерці дрэнная слава». **13.30.** Навіны. **17.00.** Сізбар-топ-10. **18.00.** Да дзён Швейцарыі ў Беларусі. Перадача 1-я. **18.20.** Тэлевізійная дошка аб'яў. **18.30.** Чарнобыль і праграма дзеянняў. **19.00.** Абласныя навіны (Віцебск). **19.10.** «Вячорні канал». Інфармацыйна-музычная праграма. (Гр.). **20.00.** Усход: міфы і рэальнасць. **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.35.** «Мачаха». Мастацкі фільм. **22.25.** НІКа. **22.40.** На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — Пад купалам сусвету.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Новости. **5.20.** Утренняя гимнастика. **5.30.** Утро. **7.45.** Фирма гарантирует. **8.20.** Веселые нотки. **8.35.** Премьера художественного фильма «Просто Мария» (Мексика). **9.20.** Мультфильмы. **9.50.** «Человек Пацифиды». Научно-популярный фильм. 1-я серия. (Австралия). **10.50, 00.25.** Пресс-экспресс. **11.20.** «Жизнь и приключения четырех друзей». Художественный фильм. 1-я серия. **11.55.** «Однокашники». Художественный фильм. 1-я серия. **13.05, 16.05, 20.40.** Международный день защиты детей. **14.25.** Деловой вестник. **15.40.** Конверсия и рынок. **15.10.** «Пчела Майя». Мультфильм. **15.35.** Теннис. Открытый чемпионат Франции. **17.25.** Межгосударственный телеканал «Останкино» представляет программу: Таджикистан, что же дальше. **17.50.** Погода. **17.55.** «Просто Мария». **18.40.** Навстречу Московскому кинофестивалю. **18.55.** Тема. **19.40.** Спокойной ночи, малыши! **23.25.** «Ныне». Курбан-байрам. **00.35.** «Человек Пацифиды». 1-я серия.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Вести. **7.25.** Время деловых людей. **7.55.** Ретро-шлягер. **8.25.** Момент истины. **9.20.** Пилигрим. **10.05, 15.45.** «Студия «Рост». **10.40.** «Кризис конституции». Документальный фильм из цикла «Власть на согласии» (США). **11.10.** «Катька — бумажный ранет». Художественный фильм. **12.40.** Крестьянский вопрос. **14.25.** По страницам «Вечернего салона». **15.00.** Телебиржа. **15.30.** Там-там новости. **16.15.** Трансросэфир. **17.00.** Золотая ветвь. **17.30.** Как нам обустроить Россию. **17.50.** Клиповая аллея. **18.05.** Вокруг Кремля. **18.45.** Праздник каждый день. **19.25.** Премьера художественного телефильма «Санта-Барбара». 174-я серия. **20.15.** Площадь искусств. **21.25.** Хранители истины. **22.20.** Автомиг. **22.25.** Звезды говорят. **22.30.** Спортивная карусель. **22.35.** «Путешествие». Мультфильм для взрослых. **22.45.** На сессии ВС Российской Федерации. **23.00.** Тихий дом.

ПОЛЬША-І

7.00. «Лорка — смерть поэта». Сериал пр-ва Испании. **8.00.** Антенна. **8.35.** Художественный фильм. **9.00.** Музыкальная программа. **10.00.** Новости. **10.10.** Мама и я. **10.25.** Дошкольники дома. **10.50.** Поговорим о детях. **11.00.** Сериал пр-ва Англии. **12.00.** Рынок труда. **12.20.** Приятное с полезным. **12.40.** Кулинарная программа. **12.45.** Клуб одиноких сердец. **13.00.** Новости. **13.10.** Программа дня. **13.15.** Сельскохозяйственная программа. **13.50.** Документальный сериал. **14.25.** День ребенка. **14.30.** Кухня. **14.45.** День ребенка. **14.50.** Рисуй с нами. **15.00.** Книга чудес техники. **15.15.** Играет музыка. **15.30.** Клуб домашнего компьютера. **15.50.** Документальный сериал. **16.20.** Мы в космосе. **16.35.** Джойстик. **17.00.** Программа на вечер. **17.05.** Открытая студия. **17.50.** Музыкальная программа. **18.00.** Телеэкспресс. **18.25.** Документальный фильм. **20.00.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **20.55.** 7 минут для министра труда. **21.00.** Польские зоопарки. **21.30.** «Окончательный вердикт». Фильм пр-ва США. **23.05.** Письма о хозяйстве. **23.45.** Вечерние новости. **00.00.** Музыкальная программа. **00.10.** Беседы с Никодимом. **01.00.** Горячая линия. **01.30.** Репортаж. **02.15.** «Сеанс». Фильм пр-ва Польши. **03.30.** Телетеатр. **04.35.** Развлекательная программа.

ПОЛЬША-ІІ

9.00. Панорама. **9.05.** Местная программа. **9.35.** «Аннетта». Мультсериал. **10.10.** «Поколения». Сериал пр-ва США. **10.35.** Мир женщин. **11.05.** Экспресс репортеров. **11.35.** Развлекательная программа. **12.05.** Богуслав Качинский приглашает детей. **13.30.** Сможет и ребенок. **14.00.** Панорама. **14.05.** Отчизна. **14.20.** «Сто лет и домой». Фильм пр-ва США. **15.00.** Открытая студия. **16.00.** Документальный фильм. **16.50.** Программа на вечер. **17.00.** Из Краковского архива. **17.20.** Тележурнал. **17.30.** Панорама. **17.35.** Отчизна. **17.50.** «Аннетта». Мультсериал. **18.20.** «Иной дом». Документальный фильм. **18.40.** Моя вера. **19.00.** Местная программа. **19.35.** «Поколения». Сериал пр-ва США. **20.10.** Спорт. **21.10.** Концерт. **22.00.** Панорама. **22.30.** Спорт. **22.45.** Колесо фортуны. Телетурнир. **23.20.** «Сердце Йошуи». Художественный фильм. **01.00.** Панорама.

2, СРЕДА

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. **8.10.** Пад купалам сусвету. **8.25.** Фільм-канцэрт. **9.20.** «Мачаха». Мастацкі фільм. **12.05.** Калі хочаш быць здаровы. **12.35.** Менестрэль-2. Частка 1-я. **13.30.** Навіны. **17.20.** Дзённік Прынёмання. (Гр.). **17.35.** Гродзеншчына спартыўная. (Гр.). **18.00.** Да дзён Швейцарыі ў Беларусі. Перадача 2-я. **18.20.** «Гарадніца». Літаратурна-мастацкая праграма. (Гр.). **19.10.** «Пяць зорак». Тэлегульня. **20.00.** Угледзьцеся ў твар... **20.30.** Спажывецкія клопаты. **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.35.** «Мачаха». **22.25.** НІКа. **22.40.** На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — Пад купалам сусвету.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.05. Новости. **5.20.** Утренняя гимнастика. **5.30.** Утро. **7.55.** Фирма гарантирует. **8.20.** Мультфильм. **8.35.** Премьера художественного фильма «Просто Мария». (Мексика). **9.20.** Торговый мост. **9.50.** «Человек Пацифиды». Научно-популярный фильм. 2-я серия. (Австралия). **10.50, 00.10.** Пресс-экспресс. **11.20.** «Жизнь и приключения четырех друзей». Художественный фильм. 2-я, 3-я и 4-я серии. **12.50.** «Однокашники». Художественный фильм. 2-я серия. **14.25.** Телемикст. **15.10.** Телешоу «50х50». **16.30.** Клуб 700. **17.25.** Межгосударственный телеканал «Останкино» представляет программу «Отражение». **17.50.** Погода. **18.00.** «Просто Мария». **18.45.** Миниатюра. **19.00.** ТВ-версия. **19.40.** Спокойной ночи, малыши! **20.40.** Пушкину посвящается. **21.10.** Футбол. Отборочный матч чемпионата мира. Сборная Исландии — сборная России. **23.25.** Л-клуб. **00.20.** «Человек Пацифиды». 2-я серия.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Вести. **7.25.** Время деловых людей. **7.55.** Площадь искусств. **9.05.** Репортер. **9.20.** У Ксюши. **9.50.** Золотая ветвь. **10.20.** Петербуржцы в столице. **11.00.** Киноглаз. **12.40.** Крестьянский вопрос. **13.25.** Досуг. **13.40.** Зигзаг удачи. **14.40.** Концерт. **15.00.** Бизнес: новые имена. **15.15.** Там-там новости. **15.30.** Студия «Рост». **16.00.** Трансросэфир. **16.45.** «Ролан Гаррос». Теннисный турнир. **17.15.** Я хочу жить. **17.45.** Наш сад. **18.15.** Как нам обустроить Россию. **19.25.** Праздник каждый день. **19.35.** 60 минут. **20.35.** На сессии ВС Российской Федерации. **21.30, 22.30.** Хоккей. Кубок Стэнли. Финал. 1-й период. **22.20.** Автомиг. **22.25.** Звезды говорят. **00.20.** Баскетбольное обозрение.

ПОЛЬША-І

7.00. Кофе или чай? **10.00.** Новости. **10.10.** Мама и я. **10.25.** Дошкольники дома. **10.50.** Поговорим о детях. **11.00.** «Смерть ученика». Сериал пр-ва Германии. **12.00.** Документальный фильм. **12.30.** Публицистическая программа. **13.00.** Новости. **13.10.** Программа дня. **13.15.** Сельскохозяйственная программа. **13.45.** Путешествие в незнакомое. **14.05.** Наш век. **15.00.** «Смерти вопреки». Документальный фильм. **15.25.** Каталог памятников. **15.35.** Документальный фильм. **16.05.** Под обстрелом. **16.30.** Композитор и его город. **17.00.** Программа на вечер. **17.05.** Программа для подростков. **17.50.** Музыкальная программа. **18.00.** Телеэкспресс. **18.25.** Художественный фильм. **19.05.** Экологический журнал. **19.35.** Лаборатория. **20.00.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **21.15.** Спортивная студия. **23.05.** Наше, польское... **23.30.** Что слышно? **23.45.** Новости. **00.00.** Музыкальная программа. **00.10.** Горячая линия. **00.20.** «Ошеломление». Фильм пр-ва Польши. **02.00.** Развлекательная программа. **02.15.** «Белое танго». Сериал пр-ва Польши. **03.20.** Это люблю. **04.00.** Важнейшие события XX века.

ПОЛЬША-ІІ

9.00. Панорама. **9.05.** Местная программа. **9.35.** «Приключения Гукки Фина». Сериал пр-ва Японии. **10.10.** «Поколения». Сериал пр-ва США. **10.35.** Мир женщин. **11.05.** Сообщество в культуре. **11.35.** Развлекательная программа. **12.00.** Панорама. **12.05.** Студия второй программы. **12.15.** Спортивная студия. **13.00.** Студия второй программы. **13.10.** Развлекательная программа. **13.30.** Автожурнал. **14.00.** Панорама. **14.05.** Сериал пр-ва Швеции. **15.00.** Открытая студия. **16.00.** «Гражданин Д». Документальный фильм. **16.50.** Программа на вечер. **17.00.** Артист и его мир. **17.30.** Панорама. **17.35.** Спорт. **17.45.** Розыгрыш лото. **17.50.** «Приключения Гукки Фина». Сериал пр-ва Японии. **18.15.** Меандры архитектуры. **18.35.** Журнал купцов и промышленников. **19.00.** Местная программа. **19.30.** Панорама. **19.35.** «Поколения». Сериал пр-ва США. **20.00.** Документальный сериал. **20.50.** Тени жизни. **21.00.** Сериал пр-ва Швеции. **22.00.** Панорама. **22.30.** Экспресс репортеров. **23.00.** Телетеатр. **00.20.** Наш город — Лодзь. **01.00.** Панорама.

3, ЧЕТВЕРГ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. **8.10.** Пад купалам сусвету. **8.25.** «Прайшло сто гадоў». Фільм-канцэрт. **8.55.** Тэлебачанне — школе. **9.00.** «Марыям і Тадэвуш». Тэлефільм. **9.20.** «Мачаха». Мастацкі фільм. **10.10.** Паміж намі, жанчынамі... **10.55.** «Куды даскача ранняя птушка». Мастацкі фільм. **12.15.** «Дарога». Дакументальны фільм. **12.40.** «Менестрэль-2». Частка 2-я. **13.30.** Навіны. **17.40.** Дзіцячая тэлефілармонія. **18.10.** Да дзён Швейцарыі ў Беларусі. Перадача 3-я. **18.30.** Навіны Бі-бі-сі. **19.00.** Абласныя навіны (Гр.). **19.10.** Зачытайце маё пісьмо... **19.15.** Урокі прадпрымальніцтва. (Гр.). **19.50.** Экалогія і мы. Прамая лінія. (Гр.). **20.25.** Пазіцыя ўрада. **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.35.** «Мачаха». **22.25.** Творчае маладзёжнае аб'яднанне «Крок» прадстаўляе. **23.35.** На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — Пад купалам сусвету.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Новости. **5.20.** Утренняя гимнастика. **5.30.** Утро. **7.45.** Фирма гарантирует. **8.25.** Премьера художественного фильма «Просто Мария» (Мексика). **9.10.** Фильм-концерт. **9.50.** «Человек Пацифиды». Научно-популярный фильм 3-я серия. (Австралия). **10.50, 23.50.** Пресс-экспресс. **11.20.** «Станционный смотритель». Художественный фильм. **12.25.** Премьера документального фильма «Врата свободы». **14.30.** Теннис. Открытый чемпионат Франции. **15.10.** Блокнот. **15.15.** «Пчела Майя». Мультфильм. **16.10.** Джем. **16.40.** ... До 16 и старше. **17.55.** Погода. **18.00.** «Просто Мария». **18.50.** Я истину улыбкой поверяю. **19.40.** Спокойной ночи, малыши! **20.40.** Лотто «Миллион». **21.10.** Репортаж ни о чем. **21.25.** Художественный фильм «Путь в высший свет». (ФРГ, Франция, Италия). **23.20.** Возможно все. **00.00.** «Человек Пацифиды». 3-я серия.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Вести. **7.25.** Время деловых людей. **7.55.** Утренний концерт. **8.15.** Ура, каникулы! «Безумная Лори». Художественный фильм. **10.15.** Козырная дама. **11.00.** Художественный телефильм «Санта-Барбара». 174-я серия. **11.50.** Наш сад. **12.20.** Возвращение. **12.40.** Крестьянский вопрос. **13.25.** «Хроника пикирующего бомбардировщика». Художественный фильм. **14.40.** Параллели. **15.00.** Там-там новости. **15.15, 00.05.** «Ролан Гаррос». Теннисный турнир. **16.15.** Трансросэфир. **17.00.** Обратный адрес. **17.30.** М-трест. **17.45.** Парламентский час. **18.45.** Праздник каждый день. **19.25.** «Санта-Барбара». 176-я серия. **20.15.** Хроно. **20.45.** «Почему деревья не говорят». Мультфильм для взрослых. **21.00.** Неопалимая купина. **21.30.** Не плюй в колодец. **22.20.** Автомиг. **22.25.** Звезды говорят. **22.30.** Спортивная карусель. **22.35.** Экран криминальных сообщений. **22.45.** Балет Санкт-Петербурга. **23.35.** Новый иллюзион.

ПОЛЬША-І

7.00. «Белое танго». Сериал пр-ва Польши. **8.15.** «Клиника в Шварцвальде». Сериал пр-ва Германии. **9.00.** Это люблю. **10.00.** Новости. **10.10.** Мама и я. **10.25.** Дошкольники дома. **10.50.** Поговорим о детях. **11.00.** «Клуб «Парадайс». Сериал пр-ва США. **11.50.** Сто лет. **12.30.** Документальный фильм. **13.00.** Новости. **13.10.** Программа дня. **13.15.** Сельскохозяйственная программа. **13.50.** Подводная одиссея команды Кусто. **14.40.** Документальный фильм. **15.05.** Мы живем в Польше. **15.25.** Вокруг света. **15.50.** Животные мира. **16.15.** Школа под парусами. **16.35.** Мы взрослые. **17.00.** Программа на вечер. **17.05.** Программа для молодежи. **17.50.** Музыкальная программа. **18.00.** Телеэкспресс. **18.25.** «Клиника в Шварцвальде». Сериал пр-ва Германии. **19.10.** Католический журнал. **19.30.** Штрих к портрету. **19.45.** Сатирическая программа. **20.00.** Музыкальный ящик. **20.10.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **21.15.** «Клуб «Парадайс». Сериал пр-ва США. **22.10.** Только в первой программе. **22.50.** Поет Эдита Бартошевич. **23.15.** Пегас. **23.45.** Новости. **00.00.** Музыкальная программа. **00.10.** Документальный фильм. **00.15.** Спокойной ночи. **01.20.** Горячая линия. **01.30.** Я это люблю. **02.30.** «Лук эроса». Фильм пр-ва Польши. **04.10.** Документальный фильм.

ПОЛЬША-ІІ

9.00. Панорама. **9.10.** Местная программа. **9.40.** Жизнь в зоопарке. **10.00.** Студия второй программы. **10.10.** «Поколения». Сериал пр-ва США. **10.35.** Мир женщин. **11.05.** «Норвид». Документальный фильм. **11.40.** Развлекательная программа. **12.00.** Панорама. **12.05.** Студия второй программы. **12.15.** Художественный фильм. **14.00.** Панорама. **14.05.** Киносеанс. **14.35.** Польский рок. **15.00.** Открытая студия. **16.00.** Программа для молодежи. **16.25.** Документальный фильм. **16.55.** Программа на вечер. **17.00.** Большой мяч. **17.30.** Панорама. **17.35.** Повторение прошлого. **17.50.** Жизнь в зоопарке. **18.15.** Общая Европа. **18.50.** Публицистическая программа. **19.00.** Местная программа. **19.30.** Панорама. **19.35.** «Поколения». Сериал пр-ва США. **20.00.** Документальный фильм. **20.20.** Женщины джаза. **21.00.** Музыкальный фестиваль. **22.00.** Панорама. **22.30.** Спорт. **22.45.** Колесо фортуны. **23.20.** «Премьера». Фильм пр-ва США. **01.40.** Трансляция с выставки. **01.15.** Спортивная студия.

4, ПЯТНИЦА

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. **8.10, 02.35.** Пад купалам сусвету. **8.25.** «Георгій Майбарада». Фільм-канцэрт. **9.20.** «Мачаха». Мастацкі фільм. **10.10.** Майстэрня. **10.50.** «Віядук». Мастацкі фільм. **12.20.** «Менестрэль-2». Частка 3-я. **13.15.** Пазіцыя ўрада. **13.30.** Навіны. **17.20.** ПІК. **18.20.** Дзённік Прынёмання. (Гр.). **18.25.** Толькі па пятніцах. Інфармацыйна-публіцыстычная праграма. (Гр.). **19.10.** Эпіцэнтр. **19.55.** «Кугітанг». Кінанарыс. **20.10.** «1308». Конкурс песні. **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.30.** На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. **22.00.** Адкрыццё І Беларускага фестывалю песні і паэзіі. **00.50.** НІКа. **01.05.** Мастацкі фільм «Нью-Йорк, 4 раніцы». (Польшча).

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Новости. **5.20.** Утренняя гимнастика. **5.30.** Утро. **7.45.** Фирма гарантирует. **8.20.** «В гостях у сказки». Художественный фильм «Марья-искусница». **9.50.** Клуб путешественников (с сурдопереводом). **10.50, 01.05.** Пресс-экспресс. **11.25.** Ассоциация детского телевидения. **11.55.** «Милый лжец». Фильм-спектакль. **14.25.** Бридж. **14.50.** Бизнес-класс. **15.05.** Блокнот. **15.10.** «Пчела Майя». Мультфильм. **15.40.** К Всемирному дню окружающей среды. **16.10.** Наш музыкальный клуб. **16.50.** Технодром. **17.20.** Межгосударственный телеканал «Останкино» представляет программу «Общий рынок для СНГ». **17.40.** Погода. **17.45.** Человек и закон. **18.15.** Вагон «03». **18.45.** Поле чудес. **19.40.** Спокойной ночи, малыши! **20.40.** Человек недели. **20.55.** Художественный фильм «Смерть в кино». **23.15.** ВИД представляет: Политбюро, Музобоз, Автошоу, Площадка обоза.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Вести. **7.25.** Время деловых людей. **7.55.** Неопалимая купина. **8.25.** Джентльмен-шоу. **8.55.** В мире животных. **9.55.** «К-2» представляет... **10.50.** Досуг. **11.05.** Художественный телефильм «Санта-Барбара». 175-я серия. **11.55.** Лунная женщина. **12.40.** Крестьянский вопрос. **13.25.** Ижица. **13.55.** «Горячее сердце». На спектакле в Малом театре. **14.50.** «Пресвятая троица». Документальный фильм. **15.10.** Телебиржа. **15.40.** Там-там новости. **15.55.** Студия «Рост». **16.25.** Трансросэфир. **16.55.** «Сослан на планету Земля». Художественный фильм. 13-я серия. **17.45.** Парламентский час. **18.45.** Праздник каждый день. **19.25.** Премьера телеэкрана. «У смерти плохая репутация». Художественый фильм. **21.10, 22.35.** Хоккей. Кубок Стэнли. Финал. **22.20.** Автомиг. **22.25.** Звезды говорят. **22.30.** Спортивная карусель. **00.05.** Задорнов плюс «Плюс». **00.55.** Ночной клуб «Эс-эн-си».

ПОЛЬША-І

7.00. Кофе или чай. **10.00.** Новости. **10.10.** Мама и я. **10.20.** Дошкольники дома. **11.00.** «Обезьяна зимой». Фильм пр-ва Франции. **12.15.** Четверть часа на экране. **13.00.** Новости. **13.10.** Программа дня. **13.15.** Сельскохозяйственная программа. **13.45.** Только у нас. **13.55.** Тема дня. **14.00.** Взгляд на Германию. **14.30.** Документальный сериал. **14.55.** О поэзии. **15.10.** Телепластикон. **15.25.** Тема дня. **15.30.** Вокруг книги. **16.00.** Евротуристика. **16.15.** Такая жизнь. **16.30.** Тема дня. **16.35.** Если не Оксфорд, то что? **16.55.** Какая школа? **17.00.** Программа на вечер. **17.05.** Для детей. **17.50.** Музыкальная программа. **18.00.** Телеэкспресс. **18.20.** Важнейшие события XX века. **19.00.** Право и бесправие. **19.20.** Свидание «в темную». **20.00.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **21.15.** «Изабелла». Фильм пр-ва Италии. **23.00.** Репортер. **23.45.** Вечерние новости. **00.00.** Музыкальная программа. **00.10.** Горячая линия. **00.20.** Документальный фильм. **01.35.** Французская песня. **02.25.** Агнешка Осецкая приглашает. **03.20.** «Аквен Эльдорадо». Сериал пр-ва Польши. **04.05.** Программа Французского телевидения.

ПОЛЬША-ІІ

9.00. Панорама. **9.05.** Местная программа. **9.35.** Мультфильм. **10.00.** Студия второй программы. **10.10.** «Кэт и Алли». Сериал пр-ва США. **10.35.** Мир женщин. **11.05.** Литературный журнал. **12.00.** Панорама. **12.05.** Студия второй программы. **12.10.** Программа о животных. **13.00.** Студия второй программы. **13.10.** Необитаемый остров. **14.00.** Панорама. **14.05.** «Австралийцы». Документальный фильм. **14.50.** Музыкальная программа. **15.35.** Развлекательная программа. **16.00.** Спортивная студия. **16.55.** Программа на вечер. **17.00.** Программа для молодежи. **17.30.** Панорама. **17.40.** «Кэт и Алли». Сериал пр-ва США. **18.05.** Мультсериал. **18.30.** «Прерванный фильм». Документальный фильм. **19.00.** Местная программа. **22.00.** Панорама. **22.30.** Спорт. **22.45.** Колесо фортуны. **23.20.** «На пути к сумасшествию». Фильм пр-ва США. **00.45.** Развлекательная программа. **01.15.** Панорама. **01.25.** Телетеатр.

5, СУББОТА

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. **8.10, 00.50.** Пад купалам сусвету. **8.25, 9.00** Мастацкі фільм. «Нью-Йорк, 4 раніцы». (Польшча). **8.55.** Тэлебачанне — школе. **10.00.** Паказвае Брэст. **11.00.** Тыдзень планеты. **11.15.** Далучэнне. **11.25.** 20 мінут рэдактара. **11.45.** Урокі здароўя. **12.15.** Роднае слова. **12.45.** Для дзяцей. «Пра ўсё і ні пра што». **13.15.** Мультфільм. **13.25.** Хрысціянская праграма. **14.00.** Творчае маладзёжнае аб'яднанне «Крок» прадстаўляе. **15.30.** Брама. **16.20.** Мастацкі фільм «Мы — вундэркінды». (Германія). **18.00, 22.00, 01.00.** І Беларускі фестываль песні і паэзіі. **19.50.** Нашы госці — коласаўцы. **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.35.** «Кола». Кароткаметражны фільм.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

6.00, 14.00, 20.00, 23.00. Новости. **6.25.** Утренняя гимнастика. **6.35.** Пресс-экспресс. **6.45.** Субботнее утро делового человека. **7.30.** Спорт-шанс. **8.00.** Погода. **8.05.**«Марафон-15» представляет. **8.30.** Экстро-НЛО. **9.00.** Автограф по субботам. **9.30.** Экологическое обозрение. **9.45.** Медицина для тебя. **10.25.** Пусть дни проходят... **11.15.** Слово. **11.45.** Киноправда? Художественный фильм «Валерий Чкалов». **14.25.** Азбука собственника. **14.35.** Теннис. Открытый чемпионат Франции. **15.35.** Центральный экспресс. **16.05.** Мультфильм. **16.50.** Красный квадрат. **17.30.** В мире животных. **18.10.** «Оба-на-угол». Шоу. **18.40, 20.40.** Премьера художественного фильма «Последние дни Помпеи». 6-я и 7-я серии. **19.40.** Спокойной ночи, малыши! **21.20.** Что? Где? Когда? **22.20.** Студия «Резонанс» представляет. **22.45.** Погода. **22.50.** Музыкальная мозаика. **23.20.** Футбол. Чемпионат России. «Динамо» (Москва) —«Ротор» (Волгоград).

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Вести. **7.25.** Свой взгляд на мир. **7.50.** Мульти-пульти. **8.00.** Формула-730. **8.30.** Студия «Рост». **9.00.** Непознанная вселенная. **9.30.** «Бурда моден» предлагает... **10.00.** Поездка Грибоедова к Чаадаеву. **10.15.** Как жить будем? **11.00.** «Заложница». Художественный фильм. **12.25.** Мульти-пульти. **12.35.** Телеэрудит. **12.40.** Крестьянский вопрос. **13.20.** Пилигрим. **14.05.** Музыка крупным планом. **14.50.** Изабель. **15.35.** Золотая шпора. **16.05.** Теннисный турнир. «Ролан Гаррос». Франция. **17.05.** Кино в июне. **17.20.** Футбол без границ. **18.15.** Устами младенца. **18.45.** Праздник каждый день. **19.25.** Премьера телеэкрана. «Умирать не страшно». **21.00.** Совершенно секретно. **22.20.** Автомиг. **22.25.** Звезды говорят. **22.30.** Спортивная карусель. **22.35.** Программа «А». **23.35.** «Семь невест ефрейтора Збруева». Художественный фильм.

ПОЛЬША-І

8.25. Программа дня. **8.30.** Информационно-хозяйственный журнал. **9.35.** Все об огороде. **10.00.** Новости. **10.10.** «Зерно». Программа католической редакции для детей. **10.35.** Программа для детей и молодежи. **11.50.** Английский язык для детей. **12.00.** Документальный фильм. **13.00.** Новости. **13.20.** Путешествие в Южную Америку. **14.00.** «60/90». Музыкальный журнал. **15.00.** Мультфильмы У. Диснея. **15.45.** Телетеатр. А. Фредро. «Пан Ювяльский». **18.00.** Телеэкспресс. **18.25.** «Детектив в сутане». Сериал пр-ва Англии. **19.20.** Развлекательная программа. **20.00.** Детский журнал. **20.10.** Вечерний выпуск новостей. **21.00.** Польские зоопарки. **21.30.** «Миллионы Бревстера». Фильм пр-ва США. **23.15.** Концерт. **00.05.** Новости. **00.15.** Спортивная суббота. **00.40.** Ночное кино. «Злые демоны». Фильм ужасов пр-ва США. **02.05.** Спортивная студия. **02.45.** Иная музыка. **03.05.** «Аквен Эльдорадо». Сериал пр-ва Польши. **03.55.** Ночи в Лас-Вегасе.

ПОЛЬША-ІІ

8.30. Военно-документальная программа. **9.00.** Панорама. **9.05.** Программа для детей. **10.05.** «Такие одинокие». Программа для глухонемых. **10.25.** Урок языка глухонемых. **10.30.**

АПОШНЯЯ СТАРОНКА

Дзьверы. Фатаграфаваў А. УЛАДАСЕВІЧ.

Зоркі аб здароўі і каханьні

31 траўня — 6 чэрвеня

АВЭН, 31-га і 1-га неабходна правесьці прафілактыку захворванняў. Сачыце за харчаваньнем. Аддайце перавагу стравам з рыбай, цыбуляй, рысам. Як найменей мяса. Не злоўжывайце касмэтыкай — узьнікне раздражненьне скуры. Пажадана кожны дзень дыхаць сьвежым паветрам. Не прымайце важных рашэньняў, не пачынайце значных спраў 1-га й 2-га.

Справы ў **БЫКА** ідуць нядрэнна, але пэрыядамі. Магчыма кароткатэрміновая паездка, новыя знаёмствы й амурныя прыгоды. Неабходна сачыць за здароўем і рабіць паласканьне горла. Паслухайце сваю любімую музыку — гэта дазволіць пазбавіцца мэлянхоліі і ўздыме настрой. Пажадана ужываць капусту, цыбулю, буракі. Гарбата з лімонам будзе добрым стымулятарам.

БЛІЗЬНЯТЫ адчуваюць няўпэўненасьць і некаторыя цяжкасьці ў каханьні. Ёсць шанц канфлікту з чалавекам, якога вы кахаеце. У гэтых адносінах напружаныя дні 1-га й 3-га чэрвеня. Пачынайце прафіляктыку й лекаваньне вашых хранічных захворванняў 2-га й 3-га — не высьвятляйце ў гэтыя дні адносіны з сябрамі й блізкімі. Ужывайце капусту, буракі, яблыкі й малочныя стравы. Моцныя напоі супрацьпаказаны 2-га, 4-га, 6-га.

РАК будзе адчуваць стомленасьць. Імкніцеся болей адпачываць. Адмоўцеся ад мучных страваў. Не ўжывайце піва й шыпучых вінаў. Не ад´язджайце ў паездкі 3-га й 4-га. Сустрэчы з сябрамі й каханымі 1-га й 2-га будуць напружанымі, магчымы нават канфлікты. Пашанцуе 6-га чэрвеня.

ІЛЬВУ неабходна зьвярнуць увагу на сэрца, ўпарадкаваць ражым дня. Амурныя прыгоды на гэтым тыдні могуць прынесьці непрыемнасьці. Важнае рашэньне давядзецца прымаць 2-га чэрвеня. Не ўжывайце моцных напояў. Зьвярніце ўвагу на страўнік: як мага менш мясных вырабаў. Апэтыт кампэнсуйце садавінай і гароднінай. Магчыма частая зьмена настрою. Інтуіцыя дапаможа разабрацца, хто сябра, а хто вораг.

Акуратнасьць, ашчаднасьць, асьцярожнасьць зараз вельмі спрыяюць **ПАНЬНЕ**. Багата часу будзе займаць праца й тут ужо не да інтымных адносін. Надайце больш увагі здароўю, асабліва 2-га й 3-га. Дзелавую адктыўнасьць карысна панізіць да 7-га й 8-га. Будзьце пільнымі на дарогах, магчымы траўмы. 5-га не выключаны канфліктныя сітуацыі.

ШАЛЯМ неабходна паклапаціцца ня толькі аб сваім здароўі, але й аб пачуваньні сваіх блізкіх. Зьвярніце ўвагу на ныркі: настаў час зрабіць прафіляктычныя захады. Папіце ныркавай гарбаты й настою рабіны, ядлаўцу й пятрушкі. Інтуіцыя на гэтым тыдні дапаможа высьветліць значныя для вас пытаньні. Сустрэча 6-га станоўча паўзьдзейнічае на тое, каб зноў аднавілася цікавасьць да каханьня.

СКАРПІЁНУ неабходна адпачыць, бо бясконцыя клопаты адмоўна ўплываюць на жыцьцё. 1-га й 2-га не зусім удалыя дні для вырашэньня важных праблемаў. Здароўе не самае лепшае на гэтым адмежку часу. Памятайце аб гэтым асабліва на пачатку чэрвеня, бо непрыемнасьці на працы адаб´юцца на самаадчуваньні й настроі. Асьцерагайцеся ўжываць сьпіртное 4-га й 6-га чэрвеня.

Карысна падвесьці вынікі **ЛУЧНІКУ**, якіх ўдалося дасягнуць у траўні й прааналізуйце іх. Вы здольны ўзьдзейнічаць на акружаючых і дасягнуць посьпеху. Вашыя дні 5-га й 6-га чэрвеня. Не заключайце зьдзелак і адмоўцеся ад закупаў. Адзін з вашых сяброў можа нашкодзіць вам сваёй празьмернай балбатлівасьцю й нястрыманасьцю. Асаблівую ўвагу зьвярніце на здароўе 2-га й 3-га.

Як і раней, натхнёнасьць ня будзе пакідаць **КАЗЯРОГА**. Зьвярніце ўвагу на ногі й суставы. Магчыма, нехта са знаёмых выступіць з цікавай прапановай, якая прынясе вам карысьць. Адкладзіце паездкі 3-га й 4-га й адмоўцеся ад інтымных кантактаў. Недапушчальна ўжываньне алкаголю. Можаце быць уцягнуты ў сварку. Не бярыцеся кіраваць аўтамабілем.

ВОДНІКУ найлепей пайсьці ў адпачынак і зьмяніць абстаноўку. 2-га зьвярніце ўвагу на інтуіцыю, яна вас не падвядзе. 3-га й 4-га пажадана панізіць дзелавую актыўнасьць. Стасункі з супрацьлеглым полам наўрад ці прынясуць радасьць. У канцы тыдня магчыма цікавае знаёмства.

Палепшыцца фінансавае становішча ў **РЫБАЎ**. Магчымы болі ў нагах і ступнях. Нягледзячы на лета, лепей не прастывайце. Паболей ужывайце вітамінаў і часьцей бывайце на сьвежым паветры. 3-га й 4-га застаньцеся дома й адпачніце ад важных спраў. Вэнера паўзьдзейнічае на пачуцьці: захочацца цеплыні й каханьня.

Падрыхтаваў А. КАНДРАШОЎ.

З крымінальнай хронікі

■

На аб´яздной дарозе ў вёсцы Бастуны Воранаўскага раёна затрыманы дзьве аўтамашыны-бензавозы. Грамадзяне Летувы спрабавалі вывезьці за межы Беларусі звыш 10 тон паліва.

У жыхара горада Чымкент Сатыбэкава пры даглядзе на КПП Беняконі сканфіскавана 70 жаночых гадзіньнікаў, якія ён спрабаваў вывезьці ў Летуву.

■

На аўтобусным прыпынку па вул. Маставой побач з тонкасуконным камбінатам у Горадні раптам дрэнна пачулася 63-гадовая жанчына. Як высьветлілася, яна атруцілася парай сернай кіслаты, якія выходзілі з дзесяцітоннай ёмістасьці, што месьціцца на тэрыторыі камбіната. Уцечка пары адбылася з-за дрэннай пракладкі ў цыстэрне. Жанчына зьмешчана ў рэанімацыю.

■

Жыхарка Ськідаля, пэнсіянерка пры разьліку ў Аграпрамбанку падала беларускую купюру вартасьцю пяць рублёў. На ёй фарбаю побач з пячаткаю быў дамаляваны нуль. Адкуль зьявілася ў яе гэтая купюра, жанчына патлумачыць ня здолела.

17 траўня з хаты выйшаў вучань 6 класа Гарадзенскай школы № 15 Арцём Дарашкевіч, 1980 года нараджэньня, і не вярнуўся.

18 траўня са школы не вярнуўся другі вучань гэтай самай школы — Арцём Хоміч, вучань восьмага класа. Абодва хлопцы й раней неаднаразова ўцякалі з дому.

■

У калідоры сярэдняй школы № 20 па вуліцы Соламавай у Горадні падчас забавы вучні разьбілі шкло. Ад аскепкаў глыбокае раненьне грудной клеткі атрымала дзяўчынка пятага класа, якая адразу была зьмешчана ў шпіталь.

■

14 траўня ў Нёмане побач з прафілакторыем ВА «Азот» было знойдзена цела жыхаркі Горадні, 1937 года нараджэньня, інваліда II групы.

■

16 траўня ў Пышках пад час купаньня у Нёмане ўтапіўся вучань II класа.

У той самы дзень у вёсцы Луцкаўляны Гарадзенскага раёна на рацэ Сьвіслач жыхар Горадні 1964 года нараджэньня ратаваў дзіця й сам утапіўся.

17 траўня каля вёскі Савагіні Воўкавыскага раёна ўтапіўся ў невялічкім стаўку трактарыст калгаса «Радзіма», 1945 года нараджэньня.

18 траўня на возеры ў вёсцы Азёры Гарадзенскага раёна ўтапіўся падпалкоўнік Дарагенскі, 1949 года нараджэньня. На возеры ён выдаіў рыбу.

А. ІВАНОЎ,
сябра прэс-групы УУС.

Шаноўныя спадарыні й спадары!

Газэта «ПАГОНЯ» — гэта зьвесткі з Гарадзеншчыны, Віленшчыны й Беласточчыны. Калі вас цікавіць беларускае жыцьцё ня толькі на Беларусі, але таксама ў Польшчы й Летуве, дык падпішыцеся на нашу газэту! Паўгадавы кошт — 333 рублі, індэкс — 63124. Падпіска прымаецца ў любым паштовым аддзяленьні Рэспублікі Беларусь.

Вас чакаюць ля ўвахода на могілкі...

Такая аб´ява на Гарадзенскім торжышчы за дзень паўтараецца дзесяткі разоў. Рынак па-сапраўднаму ў нашым горадзе ня мае ніякіх межаў і высокая каменная сьцяна на старых гарадзкіх могілках зусім не перашкода. Сьвятое месца, дзе спачываюць нашы продкі, выкарыстоўваецца сучаснымі сваімі й чужымі камэрсантамі як каму давядзецца ці захочацца. Часам замест прыбіральні, нехта адпачывае, выцягнуўшы ногі ад «цяжкай» працы, хтосьці, хаваючыся за помнікамі, пералічвае дзённы заробак, маўляў, мапілам давяраць можна, а камусьці папросту ніяк не знайсьці лепшага месца, каб расьпіць чарговую пляшку за ўдалы гандаль...

Яшчэ праз гучнік паведамляюць, што заахвочваюцца ахвотныя на адпачынак ажно ў Фарос, набіраюцца групы для камэрцыйнай паездкі ў Польшчу. А ў астатнім: прадаю, прадаю, прадаю...

Цэны на некаторыя харчовыя тавары на Гарадзенскім торжышчы за мінулыя выхадныя:

Сьвініна, 1 кг — ад 600 да 2000 руб.
Цяляціна, 1 кг — ад 600 да 1400 руб.
Вэнджаніна, 1 кг — ад 800 да 2500 руб.
Шынка собская, 1 кг — ад 800 да 1800 руб.
Сала салёнае, 1 кг — ад 650 да 700 руб.
Сала вэнджанае, 1 кг — 1000 руб.
Бараніна, 1 кг — 700—1100 руб.
Яйкі, дзесятак — 200—230 руб.
Масла, 250 г.— 200 руб.
Сыр «Расейскі», 1 кг — 1200 руб.
Алей, 1 л.— 350—370 руб.
Курыца, 1 шт.— 2000 руб.
Морква, 1 кг — 180—200 руб.
Бульба, 1 кг — 20—25 руб.
Капуста, 1 кг — 500 руб.
Цыбуля, 1 кг — 40—45 руб.
Цыбуля зялёная, пучок — 20—25 руб.
Рэдзька, пучок 70—80 руб.
Гуркі, 1 кг — 500 руб.
Яблыкі, 1 кг — 150—200 руб.
Гарэхі грэцкія, 1 кг — 350 руб.
Бананы, 1 шт.— 200 руб.
Мёд, 1 кг — 1500 руб.
Ружы, 1 шт.— 50—250 руб.
Гарэлка, 1 бут.— 500—550 руб.
Даляр ЗША — 1170—1200 руб.

М. ЖЫЛЕЎСКАЯ.

«ПАГОНЯ»

Рэдактар С. АСТРАЎЦОЎ

Заснавальнік: культурна-асьветніцкі фонд «Бацькаўшчына»

Адрас рэдакцыі: 230023, г. Горадня, вул. Дамініканская, 1.
Тэлефоны: 45-29-96, 45-41-83.
Газэта выдаецца штотыдзень па пятніцах.
Індэкс 63124. Ліцэнзія № 465.
Фотанабор, афсэтны друк.
Гарадзенская вабласная ўзбуйненая друкарня: 230003, г. Горадня, вул. Паліграфістаў, 4.

Падпісана да друку 27.05.1993 г.

Тыраж 3400 паасобнікаў **Замова 2615**